*Рыгор Родчанка*



# СЛУЦКАЯ СТАРАСВЕ́ТЧЫНА

*(факты і разважанні)*





Рыгор Родчанка

# СЛУЦКАЯ СТАРАСВЕТЧЫНА

(факты і разважанні)

Мінск «Полымя» 1991

ББК 63.3 (2Б)
Р61

Рэцэнзенты:

кандыдат гістарычных навук **М. Ф. Спірыдонаў;**
кандыдат філалагічных навук **В. А. Чамярыцкі**

**В книге рассказывается о некоторых фактах истории, культурной жизни Случчины со времен Киевской Руси до конца XVIII в. Читатель познакомится с судьбой и творческой деятельностью писателей, поэтов, церковных просветителей, родившихся на Случчине или работавших здесь, Соломона Рысинского, Димитрия Тупталы, Яна Андрея Белобоцкого, Эммануила Козачинского и др., узнает о развитии просвещения в Слуцке, о существовавшем здесь в XVIII в. театре, также о роли города в борьбе против католической экспансии.**

**Родчанка Р. В.**
Р 61 Слуцкая старасветчына: (Факты і разважанні).—Мн.: Полымя, 1991—71 с. іл.
ISBN 5-345-00491-9.
**Родченко Г. В.** Слуцкая старина: (Факты и размышления).

У кнізе расказваецца пра некаторыя факты гісторыі, культурнага жыцця Случчыны з часоў Кіеўскай Русі да канца XVIII ст. Чытач пазнаёміцца з лёсам і творчай дзейнасцю пісьменнікаў, паэтаў, царкоўных асветнікаў, якія нарадзіліся на Случчыне ці працавалі тут, — Саламона Рысінскага, Дзімітрыя Тупталы, Яна Андрэя Белабоцкага, Эмануіла Казачынскага і інш., даведаецца аб развіцці асветы ў Слуцку, аб існаваўшым тут у XVIII ст. тэатры, таксама аб ролі горада ў барацьбе супраць каталіцкай экспансіі.
Шырокаму колу чытачоў.

Р $\frac{0503020903-077}{M\ 306(03)-91}$ 13—92 **ББК 63.3(2Б)**

ISBN 5-345-00491-9
© Р. В. Родчанка, 1991

## З ГЛЫБІНЬ СТАГОДДЗЯЎ

Пачатковыя звесткі па гісторыі Слуцка і Случчыны змяшчаюцца ў паданнях і легендах. У канцы 60 — пачатку 70-ых гг. мною запісана некалькі твораў гэтых жанраў, у якіх прадстаўлена старажытная гісторыя горада і краю.

Найбольш распрацаваную легенду аб заснаванні Слуцка паведаміў старэйшы жыхар нашага горада Лукаш Трафімавіч Трухан (памёр ва ўзросце 86 гадоў у 1972 г.). Вось яе змест.

У далёкія часы на месцы Слуцка шумелі векавечныя лясы. Прыехаў неяк сюды на палянанне князь, пагнаўся за зверам, упаў з каня і пашкодзіў сабе нагу. На месцы здарэння ён загадаў пабудаваць горад і назваць яго Случэскам — ад «случай» (выпадак). Пасля смерці заснавальнік горада быў пахаваны за паселішчам Урэчча. З цягам часу на тым месцы ўзнікла вёска Княжая Магіла.

Герой легенды — магчыма, нейкая канкрэтная гістарычная асоба, але звесткі пра яе да нас не дайшлі. Твор звязаны і з рэальна існуючай вёскай Княжая Магіла.

Па другой легендзе Слуцк быў заснаваны купцом. Быццам плыў ён са сваім таварам па Случы. Недалёка ад упадзення рэчкі Бычок у Случ зрабіў прыпынак, сышоў на бераг. Тут яго ўкусіў змей. Паміраючы, купец завяшчаў усё сваё багацце на пабудову горада на тым месцы, дзе здарылася з ім няшчасце.

І першая і другая легенды, відавочна, адносяць за-

снаванне Слуцка як мінімум да часоў Кіеўскай Русі, а то і да больш ранняга перыяду. І гэта адпавядае дакладна вядомым фактам гісторыі, якія сцвярджаюць: у VII—VI стст. да н. э. ля ўпадзення рэчкі Бычок у Случ было гарадзішча. Курганы ў ваколіцах Слуцка, іх форма і знойдзеныя ў іх рэчы сведчаць, што ў VIII—IX стст. Случчыну засялялі славянскія плямёны дрыгавічоў.

Да часоў татарскай навалы адносіцца «Паданне пра абарону Слуцка». Гэты твор у сярэдзіне 60-ых гадоў пераслаў мне Язэп Лявонавіч Дыла[1]. Ён жа пераклаў яго на сучасную беларускую мову. На падставе «Падання...» і іншых крыніц пісьменнік стварыў гістарычную аповесць «У імя дзяцей». Фальклорны твор ён пачуў у Слуцку ад сваёй бабкі Дамінікі, казачніцы і захавальніцы народных песенных скарбаў. Фальклорныя творы ў яе пераказе запісвалі мастак-іканапісец Вяроўскі і настаўнік Слуцкай гімназіі М. І. Чудоўскі. Згодна паведамленню Дылы, запісы Чудоўскага былі выдадзены Расійскай Акадэміяй навук. Зборнік гэтага даследчыка пакуль што адшукаць не ўдалося, але вядома, што ён вывучаў гаворкі і гісторыю Случчыны. У 1889 г. Чудоўскі апублікаваў у «Русском филологическом вестнике» ў Варшаве працу пад назвай «Материалы для изучения белорусских говоров. Слуцкий говор».

Верагодна, у «Паданні пра абарону Слуцка» адлюстраваны падзеі пачатку XVI ст., калі крымскія татары напалі на Слуцк і іх напад быў адбіты. У летапісе пра гэта гаворыцца так: «И хотяху татаре взяти Случеск, и не могоша, биша бо их из града крепко».

У «Паданні...» былінны зачын:

---

[1] «Паданне пра абарону Слуцка» друкавалася на старонках слуцкай газеты «Шлях Ільіча» і ў невялікім зборніку фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў «З вечнага», які ў 1984 г. выдадзены Рэспубліканскім навукова-метадычным цэнтрам народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы. У 1990 г. выйшла другое выданне.

**А было гэта, сталася ў нас на Белай Русі!..**
**Як паўстала на ёй улада княжацкая,**
**Пачалася крыўда над людзьмі, што раней вольна жылі...**

У творы некалькі дзеючых асоб: слуцкі князь Андрэй, які ў той час быццам бы ўцёк да цесця ў Мінск, Мураш-майстар, што некалі будаваў слуцкі «дзядзінец-замак», купец-здраднік тураўскі, які вёў татараў «на тутэйшую Русь», безыменныя абаронцы Слуцка. Адна з галоўных гераінь — жонка лучніка Настася, якая разам з іншымі жанчынамі «імем сваіх дзяцей» заклікала абаронцаў горада перамагчы ворага. Народная фантазія маглаператварыць у жонку лучніка рэальную асобу — слуцкую княгіню (у яе такое ж імя).

Да гістарычнай аповесці «У імя дзяцей», у аснову якой пакладзена «Паданне пра абарону Слуцка», Язэп Дыла ў якасці эпіграфа ўзяў цытату з невядомага мне летапісу. Вось яна:

«В лето 6746 от сотворения мира (1238 г. — *Р. Р.*) приступил нечестивы Батыга ко граду Кыяву, поя его и изби людие в нем. В лето 6746 придоша мунугулы Батыговы ко Чернигову и Любче, пожгоша грады сии, перебиша и полониша людие. Прослышавше, яко княжества Случевское и Туровское богачеством славны суть, преидоша Днепр и обложиша Случеск и Туров, зане борониše зело мужи и жены градов сих».

Можа ўзнікнуць пытанне: «а ці варта пры вывучэнні гісторыі абапірацца на легенды і паданні?

Беларускі савецкі вучоны, доктар гістарычных навук М. М. Улашчык заўважыў: «Пачатковыя звесткі па гісторыі ледзь не ўсіх народаў прадстаўляюць легенды, і ледзь не ва ўсіх даследчыкаў, якія займаюцца гэтым перыядам, узнікае пытанне аб мэтазгоднасці вывучэння падобнай крыніцы. Неабходнасць вывучэння легенды вызначаецца хоць бы тым, што і самыя фантастычныя звесткі ствараліся ў свой час з нейкаю мэтаю, часта ж легенда абапіралася на факты, падаючы іх, аднак, у

моцна зменены выглядзе. Усё гэта вядзе да неабходнасці высвятлення рухаючых сіл падання, яго падасновы»[1] (Тут і далей пераклад з рускай мовы мой. — *Р. Р.*).

А што гаворыць гістарычная навука пра заснаванне Слуцка? Упершыню Слуцк упамінаецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 1116 г. Там сказана наступнае: «В лето 6624 (1116. — *Р. Р.*). Приходи Володимер на Глеба, Глеб бо бяше Дреговичи и Случеск пожег...»

Як бачым, у летапісе гаворыцца: у 1116 г. Уладзімір Манамах ваяваў з мінскім князем Глебам за тое, што апошні спаліў Слуцк, які ў той час належаў да ўладанняў Уладзіміра Манамаха. З запісу летапісца не вынікае, што менавіта ў 1116 г. Глеб спаліў Слуцк. Ён мог спаліць яго і раней (у 1115 ці ў 1114 г.), а помсціў яму Уладзімір Манамах у 1116 г.

Гісторык А. П. Грыцкевіч у сваёй кнізе «Древний город на Случи» імкнецца даказаць, што 1116 трэба лічыць годам, ад якога адлічваецца гісторыя Слуцка. Супраць гэтага паўстаюць логіка і патрыятычныя пачуцці жыхароў Слуцка і Случчыны. Год спалення нашага горада мы вымушаны лічыць годам яго заснавання.

«...Савецкай гістарычнай навукай, — піша Грыцкевіч, — прынята лічыць (зразумела, умоўна) датамі, якія пачынаюць гісторыю гарадоў, першыя ўпамінанні аб іх у старажытных летапісах, адзінай даставернай крыніцы, якая дайшла да нашага часу. Так прынята і ў Інстытуце гісторыі СССР Акадэміі навук СССР, а таксама ў іншых навуковых установах. Гэтыя даты і з'яўляюцца афіцыйнымі... А ў старажытных летапісах, — працягвае гісторык, — прыводзяцца першыя ўспаміны пра горад Слуцк пад 1116 г. Гэта дата і з'яўляецца афіцыйнай гістарычнай датай першага ўпамінання горада. Яе пры-

[1] Улащик М. М. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. М., 1985. С. 158.

маюць усе гісторыкі, пачынаючы ад М. М. Карамзіна (I чвэрць XIX ст.) і да нашых дзён, уключаючы акадэміка М. М. Ціхамірава»[1].

Не ўсе вучоныя першае ўпамінанне горада ў летапісе лічаць афіцыйнай датай, ад якой адлічваецца яго гісторыя. Зусім нядаўна, напрыклад, жыхары Кіева адзначалі 1500-годдзе свайго горада. 1500 гадоў назад, як вядома, летапісы яшчэ не вяліся...

Калі ў 1116 г. Слуцк быў спалены (мог і раней), то значыць да гэтага наш горад ужо быў. Нават пры сучасных тэмпах будаўніцтва патрэбна мінімум 15—20 гадоў для пабудовы новага горада. У XI—XII стст. гарады таксама будаваліся не за месяц і не за адзін год. Калі дапусціць, што і ў тыя часы гарады будаваліся па 15—20 гадоў, то датай, ад якой мы павінны адлічваць гісторыю, як мінімум, трэба лічыць 1101 год. Упамінанне таго ці іншага горада ў летапісе — гэта яшчэ не ўсё. Трэба паглядзець, як ён там упамінаецца, у сувязі з чым.

Яшчэ ў XVII ст. Кіева-Пячэрскі архімандрыт Іосіф Трызна адзначыў, што кіеўскі князь Уладзімір прымацаваў да заснаванае ім у 1005 г. тураўскай епархіі ў ліку іншых гарадоў і Слуцк. Ф. Ф. Серна-Салаўевіч у кнізе «Древне-русский город Слуцк и его святыни» пісаў, што ў архіўных актах Слуцкага княства горад упамінаецца пад 1086 г. Настаўнік Слуцкай гімназіі І. А. Глебаў у нарысе па гісторыі Слуцка заўважыў, што ў яго былі звесткі аб Слуцкім псалтыры XI ст. Даўно пара найбольш раннюю з гэтых дат (1005 г.) прызнаць годам, ад якога трэба адлічваць гісторыю Слуцка, і перастаць лічыць год знішчэння горада годам, ад якога адлічваецца яго гісторыя.

---

[1] Грицкевич А. П. Древний город на Случи· Мн., 1985. С. 4.

## *ЛІТАРАТУРА І КУЛЬТУРА СЛУЧЧЫНЫ XII—XV стст.*

«На сённяшні дзень не існуе ні адной працы, у якой паведамлялася б, якія манастыры былі ў розныя часы ў Беларусі і якія каштоўнасці (кнігі, іконы, начынне, аблачэнні і да т. п.) меліся ў тым ці іншым манастыры» [1], — з доляю зразумелай горычы пісаў у канцы свайго жыцця М. М. Улашчык.

Сапраўды, абагульняючай працы па гэтым пытанні ў нас пакуль што няма, але асобныя манастыры апісаны. Напрыклад, Ф. Ф. Серна-Салаўевіч у кнізе «Древне-русский город Слуцк и его святыни», выдадзенай у 1896 г., апісаў слуцкія праваслаўныя манастыры. А. П. Грыцкевіч адзначае, што аўтар напісаў сваю працу з рэлігійных пазіцый. Гэта сапраўды так, але яна каштоўная не пазіцыяй, з якой у ёй асвятляюцца рэчы і падзеі, а фактычным матэрыялам. Мы ўдзячны даследчыку ўжо хоць бы таму, што ён апісаў слуцкі Трайчанскі манастыр — буйнейшы цэнтр старажытнай беларускай культуры. На жаль, апісанне — вельмі сціслае. Мала сказана пра манастырскія будынкі, пра манастырскія могілкі, на якіх шмат было помнікаў слаўным у свой час дзеячам. Але хто ведаў, што з цягам часу ўсё гэта бясследна знікне з твару зямлі?

Кніга Ф. Ф. Серна-Салаўевіча «Древне-русский город Слуцк и его святыни» даўно зрабілася бібліяграфічнай рэдкасцю. Нават у Слуцкім краязнаўчым музеі ёсць толькі фотакопія гэтага выдання. Таму ёсць сэнс крыху спыніцца на апісаннях слуцкіх праваслаўных манастыроў, зробленых аўтарам.

Слуцкі мужчынскі Свята-Праабражэнскі манастыр, па звестках Серна-Салаўевіча, заснаваны пры Праабражэнскай царкве у 1600 г. У 1610 г. пры ім было створа-

[1] Улащик Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. С. 5.

на праваслаўнае брацтва, якому «многа сур'ёзных і салідных паслуг» аказала слуцкая княгіня Софія Юр'еўна з роду Алелькавічаў. З 6 снежня 1677 па 29 студзеня 1678 г. у адной з келляў манастыра жыў царкоўны дзеяч і пісьменнік Дзімітрый Растоўскі (Даніла Туптала). У 1797 г. тут працавала духоўнае вучылішча, якое пазней было пераўтворана ў Слуцкую духоўную семінарыю. У 1840 г. семінарыя пераведзена ў Мінск. Якраз у той час у ёй вучыўся будучы беларускі этнограф Павел Шпілеўскі: пачынаў, калі навучальная ўстанова знаходзілася ў Слуцку, а скончыў ужо ў Мінску. Цяпер былая Слуцкая духоўная семінарыя аднавіла сваю работу ў Жыровічах пад Слонімам.

Працаваў у старажытным Слуцку мужчынскі Свята-Ільінскі манастыр «У былыя часы, — пісаў Серна-Салаўевіч, — у гэтым манастыры ў Лазаравую суботу адбываўся аб'яднаны з усіх цэркваў Слуцка (а іх было аж 15. — *Р. Р.*), з Свята-Троіцкага манастыра хрэсны ход; пасля закрыцця манастыра хрэсны ход з усіх слуцкіх цэркваў накіроўваўся да драўлянай капліцы на Капыльскай вуліцы (некалі там быў Ільінскі манастыр, цяпер вуліца Урыцкага. — *Р. Р.*), дзе знаходзіўся абраз Увахода Гасподняга ў Іерусалім. Капліца гэта, напаўразбураная, з абразом, існуе і зараз (да нашага часу не захавалася. — *Р. Р.*). Каля капліцы расла старая вярба. Галоўны святар з дыяканам ламалі галінкі вярбы і раздавалі народу; хрэсны ход вяртаўся ў Свята-Троіцкі (Трайчанскі. — *Р. Р.*) манастыр, дзе адбывалася ўсяночная. Гэты выдатны старажытна-праваслаўны звычай ужо не існуе ў Слуцку: ён быў адменены ўласнаю ўладаю адным святаром» [1].

Сёння цяжка вызначыць, на якім месцы існавалі Праабражэнскі і Ільінскі манастыры. Па ўскосных дадзеных, мне ўдалося высветліць, што першы з іх раз-

[1] **Серно-Соловьевич Ф. Ф. Древне-русский город Слуцк и его святыни. Вильно, 1896. С. 6.**


мяшчаўся над рэчкаю Случчу прыкладна насупраць сучаснага будынка Дома піянераў, а другі знаходзіўся на сучаснай вуліцы Урыцкага прыкладна там, дзе цяпер працуе фабрыка хімчысткі.

«Па кліравай ведамасці 1795 г., — пісаў Серна-Салаўевіч, — Свята-Ільінскі манастыр паказаны «драўляным будынкам» з трыма прастоламі... Апрача таго, была яшчэ трапезная царквы ў імя Іаана Златавуснага і асобна — Узвіжання Чэснага Крыжа... Зараз ніякіх слядоў ад гэтага манастыра не засталося, апрача драўлянага крыжа на тым месцы»[1].

У старажытным Слуцку дзейнічаў манастыр бернардынаў. Яго будынак захаваўся да нашых дзён. Ён стаіць на сучаснай вуліцы Піянерскай у старым горадзе, над Случчу. Цяпер у ім размешчана маласасырбаза. Пабудаваны манастыр бернардынаў у 1730—1735 гг. Каля яго быў мураваны касцёл з арганам. Касцёл разбураны ў час Вялікай Айчыннай вайны. Пад манастыром знаходзіліся грабніцы слуцкіх князёў Радзівілаў.

Важнейшым на Белай Русі праваслаўным мужчынскім манастыром са старажытных часоў быў слуцкі Свята-Троіцкі (Трайчанскі). Без усялякага перабольшвання можна сказаць, што гэта помнік агульнаславянскага значэння. Знішчаны ў пачатку 30-ых гадоў нашага стагоддзя, але захавалася яго тэрыторыя і адзін будынак, якія пакуль што не ахоўваюцца. Манастыр размяшчаўся на цяперашняй вуліцы імя Карла Лібкнехта (некалі прадмесце Трайчаны). Адразу за будынкам духоўнага вучылішча (цяпер у ім працуе Слуцкае медыцынскае вучылішча), за каналам размяшчаліся манастырскія могілкі, на якіх былі пахаваны слуцкія летапісцы розных стагоддзяў, беларускія епіскапы, пісьменнік Эмануіл Казачынскі, першы генерал-губернатар Беларусі і іншых далучаных да Расіі рэгіёнаў Крачэтні-

[1] Серно-Соловьевич Ф. Ф. Древне-русский город Слуцк и его святыни. С. 6.



Галоўная царква Свята-Троіцкага манастыра (будынак не захаваўся)

каў. Пахаванні на гэтых могілках рабіліся яшчэ і ў час першай сусветнай вайны.

Слуцкі Трайчанскі манастыр у XVII—XVIII стст. быў рэзідэнцыяй кіраўніцтва беларускай праваслаўнай царквы. Між іншым у манастыры было дзве царквы: зімняя і летняя. Зімняя апальвалася — даволі рэдкая з'ява.

«У якім годзе заснаваны слуцкі Свята-Троіцкі манастыр — невядома, — пісаў Ф. Ф. Серна-Салаўевіч. — З дакладнасцю можна толькі сказаць, што гэты манастыр існаваў ужо ў пачатку XI ст.»[1]. У якасці доказаў даследчык прыводзіць такія аргументы: «У пачатку XI ст. існавала ўжо першая «Беларуская Тураўская епархія», якая не магла з'явіцца раней заснавання і адкрыцця хрысціянскіх цэркваў і манастыроў. Слуцк у той час уваходзіў у Тураўскае княства»[2].

[1] Серно-Соловьевич Ф. Ф. Древне-русский город Слуцк и его святыни. С. 8.

[2] Тамсама. С. 10.

Гэты доказ не зусім пераканаўчы, бо ў Слуцку ў пачатку XI ст. маглі быць толькі цэрквы без манастыра. А вось апошні аргумент Серна-Салаўевіча больш важкі і пераканаўчы: «Калі ў 1205 годзе... на Слуцк і суседнія з ім гарады Мазыр, Тураў, Пінск і Навагрудак напалі палякі, то ў ліку абрабаваных апошнімі цэркваў успамінаецца і слуцкі Свята-Троіцкі манастыр»[1].

Такім чынам, у пачатку XIII ст. слуцкі Трайчанскі манастыр ужо працаваў і ў ім было што рабаваць.

Аўтар многіх прац па гісторыі Слуцка настаўнік Іван Глебаў адзначаў, што ў яго былі звесткі пра слуцкі псалтыр XI ст.[2]. Ён, на жаль, не ўказаў, адкуль былі ў яго гэтыя звесткі, але яму нельга не верыць. Гэта быў выдатны гісторык і педагог. І. А. Глебаў працаваў у Слуцкай гімназіі ў 1890—1902 гг. За гэты час ён выдаў фундаментальную працу «Историческая записка о Слуцкой гимназии с 1617—1630—1901 гг.» і шэраг друкаваных справаздач аб рабоце гэтай навучальнай установы. У канцы XIX ст. прафесары Пецярбургскага універсітэта адзначалі, што выпускнікі Слуцкай гімназіі маюць веды па гісторыі на ўзроўні выпускнікоў універсітэта.

Серна-Салаўевіч сведчыць, што кіраўнікі не толькі Свята-Троіцкага манастыра, але і іншых манастыроў Слуцка прызначаліся да прыняцця Брэсцкай уніі кіеўскім мітрапалітам без усялякай залежнасці ад тураўскіх епархіяльных улад[3].

К сярэдзіне XII ст. літаратурная справа ў Тураўскім княстве (а ў яго ўваходзіў Слуцк) дасягнула значнага росквіту. Аб гэтым сведчыць творчасць Кірылы Тураўскага.

Выдатны пісьменнік старажытнасці нарадзіўся каля

---

[1] Серно-Соловьевич Ф. Ф. Древне-русский город Слуцк и его святыни, С. 10.

[2] Виленский вестник, 1904.

[3] Серно-Соловьевич Ф. Ф. Древне-русский город Слуцк и его святыни, С. 11.

1130 г. Ён добра ведаў грэчаскую мову, візантыйскую літаратуру. Пазней быў абраны тураўскім епіскапам. Кірыла Тураўскі — аўтар шматлікіх твораў (павучэнняў, слоў, царкоўных песень). Памёр каля 1182 г. Да нас дайшлі бясспрэчна напісаныя ім восем «слоў», два павучэнні, каля дванаццаці малітваў і адзін канон.

Цяжка дапусціць, каб у Слуцку ў той час не ведалі твораў свайго епіскапа. Іх, відаць, тут перапісвалі і распаўсюджвалі ў навакольных цэрквах. Імя Кірылы Тураўскага ў той час было вядома і за межамі Тураўскага княства. Яго творчасць добра ведалі ў стольным Кіеве. І сёння ўкраінцы лічаць Кірылу Тураўскага сваім пісьменнікам. Аб гэтым сведчыць «Антологія української поезії» (Киів, 1984. Т. 1). Першы аўтарскі (а не ананімны) твор у гэтым выданні — «Слова ў нядзелю па вялікадні» Кірылы Тураўскага. Крыўдна, што ў «Анталогіі беларускай паэзіі» творам выдатнага пісьменніка-прапаведніка месца пакуль што не знайшлося. А нарадзіўся ж ён і дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі. Наша паэтычная анталогія пачынаецца з твораў Францыска Скарыны і Сімяона Полацкага, якія жылі і працавалі на некалькі стагоддзяў пазней за Кірылу Тураўскага. Так механічным шляхам мы адсякаем некалькі стагоддзяў сваёй літаратурнай гісторыі, збядняем і абкрадваем самі сябе...

У другой палове XII ст. горад становіцца сталіцай удзельнага княства, якое выдзелілася са складу Турава-Пінскага.

З канца XII ст., калі памёр Кірыла Тураўскі, і да пачатку XV ст., якім можна ўмоўна датаваць Слуцкі летапіс (аб ім гаворка пойдзе далей), практычна ніякіх звестак пра літаратурнае жыццё ў Слуцку і на Случчыне пакуль што няма.

А. П. Грыцкевіч піша: «У 1395 годзе літоўскі вялікі князь Вітаўт перадаў Слуцк і Капыль брату польскага

караля Ягайлы, князю Уладзіміру Альгердавічу...»[1]. Летапіс жа паведамляе: «На весну князь великий Витовът иде и възя землю Подольскую. А князю Володимеру Олгирдовичю, тогда бывши в Киеве, и не всхоте покоры учинити и челомь ударити великому князю Витовту... Того жь лета на осен князь великий и Витовт выведе его ис Киева и дасть ему Копыл»[2]. Як бачым, у летапісе не сказана, што Вітаўт перадаў тады Уладзіміру Альгердавічу горад Слуцк, гаворыцца толькі пра перадачу яму Капыля.

« Капыль мае такую ж гісторыю, як і Слуцк, — пісаў гісторык і публіцыст XIX ст. М. Балінскі ў кнізе «Старажытная Польшча», — з той толькі розніцай, што ён мае болей ранні пачатак, бо Алелька спачатку князем Капыльскім называўся. Замак драўляны тут быў яшчэ з часоў Ягайлы».

Хто мае больш ранні пачатак — Капыль ці Слуцк, гэта нявысветленае пытанне, але М. Балінскі мае рацыю, калі сцвярджае, што Алелькавічы (Алелькі) спачатку жылі ў Капылі, а не ў Слуцку, і княства, якім кіраваў Алелька, спачатку называлася не Слуцкім, а Капыльскім. З цягам часу яно пачало называцца Капыльска-Слуцкім, а потым Слуцка-Капыльскім... І тут не проста гульня ў назвы. Змена найменняў княства адлюстроўвала рэчаіснасць. Відаць, да канца XIV ст. Слуцк усё яшчэ належаў слуцкім князям тураўскай лініі Рурыкавічаў, а Капыль — Уладзіміру Альгердавічу. Імя апошняга слуцкага князя Юрыя тураўскай лініі Рурыкавічаў упамінаецца ў 1387 г. Але мы не ведаем, калі ён памёр і калі яго горад Слуцк трапіў да Уладзіміра Альгердавіча ці да яго нашчадкаў.

А цяпер звернемся да летапіснага фрагмента, які адшуканы быў у Нясвіжы.

---

[1] Грицкевич А. П. Слуцк. Мн., 1970. С. 6.
[2] Полное собрание русских летописей. Т. 35. М., 1980. С. 65.

У 1867 г. П. А. Гільтэбрандт і А. Л. Міратворцаў у архіве Радзівілаў знайшлі, як яны паведамілі, «маленькі ўрывак са Слуцкага летапісу пачатку XV ст. у лацінскай транскрыпцыі XVIII ст.». Вось гэты летапісны фрагмент: «И зараз кнегиня град около града заложила и низина ровнаты ся и подвышаты ся почела и в коротком часе великое мнозство людзи славных, годных, можных, верных и зычливых мирян намножило ся на мешканье, и тиснути ся почали взглядом покою от неприятелев наступавших. Тая ж кнегиня церковь соборную Пресвятое Богородицы на Высоком городе названы дытынец зачавши и скончыла року 1409» [1].

Аналізуючы гэты невялічкі ўрывак, М. М. Улашчык у сваёй кнізе ўзняў больш новых пытанняў, чым адказаў на ранейшыя. Уважлівы, кваліфікаваны чытач, ён заўважыў у фрагменце такія элементы, якія даюць падставу гаварыць і пра больш ранняе паходжанне гэтага летапісу і пра больш позняе (аж на 100 гадоў). Даследчык сам да канца не вырашыў, якім часам можна датаваць урывак. Ён пакінуў вырашэнне гэтага пытання нам.

Пазнаёмлю чытачоў з аргументацыяй М. М. Улашчыка: «У летапісе, напісаным на мове, якой пісаліся беларуска-літоўскія летапісы XVI ст., сустракаюцца архаізмы, што вядуць, магчыма, нават не ў пачатак XV ст., а ў больш ранні перыяд. Асабліва гэта датычыцца тэрмінаў, якія абазначаюць умацаваную і найбольш старую частку горада. У Слуцкім летапісе гэта частка называецца ці «дытынец» (дзядзінец), ці «град». У летапісах прыкладна з сярэдзіны XV ст. цвёрда ўсталяваліся тэрміны «замак» для дзядзінца і «места» для горада, той часткі, якая ў рускіх крыніцах называецца

---

[1] Цыт. па: Улащик Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. С. 233—234.

«пасад», слова «град» калі і сустракаецца, то ў выглядзе выключэння»[1].

Як бачым, даследчык заўважыў у фрагменце з летапісу архаізмы, якія «вядуць, магчыма, нават не ў пачатак XV ст., а ў больш ранні перыяд». З другога боку фрагмент, напісаны «ў транскрыпцыі XVIII ст., на мове, якой пісаліся летапісы XVI ст.». Вось і разбярыся, калі ж напісаны фрагмент з летапісу: у пачатку XV ці ў XVI ст.

«Гільтэбрандт і Міратворцаў, — працягвае Улашчык, — відавочна, улічваючы дату, якая паказвае, што будаўніцтва слуцкага дзядзінца было закончана ў 1409 г., прымаюць гэту дату. Тое ж робіць і даследчык гісторыі Слуцка А. П. Грыцкевіч. Аднак аналіз тэксту прымушае ўсумніцца ў гэтай даце, г. зн., што запіс быў зроблены ў 1409 г. Ва ўрыўку паведамляецца, што ў Слуцку быў закладзены «град около града». Выходзіць к таму часу, калі пачалося апісанне ў летапісе будаўніцтва «града», адзін «град» ужо існаваў. Верагодней за ўсё, гэта было гістарычнае ядро горада — «Высокі горад», у якім пазней пабудавалі саборную царкву Прасвятой Багародзіцы. Паколькі ў Слуцку ў XVI ст. былі і Верхні і Ніжні замкі, прытым гэта былі самыя старажытныя часткі Слуцка, паведамленне летапісу не выклікае сумнення»[2].

Даследчык лічыць, што «град», які «заложила» княгіня, гэта, відавочна, Ніжні замак. Далей ён піша, што менавіта ў пачатку XVI ст. у горадзе адбываліся падзеі, падобныя да тых, што апісаны ў летапісе.

Улічваючы гэту крытычную заўвагу М. М. Улашчыка, А. П. Грыцкевіч у апошнім выданні сваёй кніжкі па гісторыі Слуцка дату напісання фрагмента з летапісу пазначыў не пачаткам XV, які рабіў раней, а XVI ст.

[1] Улащик Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. С. 235.

[2] Тамсама.

Не трэба было Грыцкевічу так хутка «здавацца без бою». М. М. Улашчык тут не ўсюды мае рацыю.

Княгіня, відаць, удава Уладзіміра Альгердавіча, магчыма, заклала новы горад на левым баку Случы, недалёка ад старога горада, размешчанага на правабярэжжы. Не пра будаўніцтва Ніжняга замка тут ідзе гаворка, як гэта здавалася М. М. Улашчыку, а пра закладку Новага горада. Я лічу, што вучоны тут крышачку памыліўся.

Каб выраз «град около града заложила» азначаў будаўніцтва Ніжняга замка, то далейшы тэкст летапіснага фрагмента «великое множство людзи... намножило ся на мешканье» быў бы бяссэнсіцай. Каля Ніжняга замка няма і не існавала месца для таго, каб там магло жыць шмат людзей. Гэта было магчыма толькі ў Новым горадзе, які па плошчы не ўступаў Старому гораду.

Урэшце М. М. Улашчык зрабіў такую канчатковую выснову: «У цэлым уяўляецца, што ў Слуцку... у пачатку XV ст., а можа, і значна раней, былі зроблены запісы аб падзеях, якія затым, у пачатку XVI ст., былі ўключаны ў летапіс, часткова захаваўшы архаічную мову больш ранняй эпохі... Магчыма і тое, што ў летапісе пры яго перапісванні замест «1509» было пастаўлена «1409» [1].

Дзе быў зроблены запіс — сёння мы не адкажам на гэта пытанне. У фрагменце з летапісу, які мы аналізавалі, гаворка ідзе толькі пра закладку горада. Будаваўся ж новы горад у Слуцку і рэканструяваўся стары некалькі дзесяцігоддзяў, бо толькі ў 1481 г. Алелькавічы канчаткова пераехалі з Капыля ў Слуцк.

У 1494 г. было, як сцвярджае А. П. Грыцкевіч, праведзена апісанне слуцкага Трайчанскага (Троіцкага) манастыра. У бібліятэцы манастыра налічвалася тады

[1] Улащик Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. С. 236.

45 рукапісных кніг. Пры ім працавала школа перапісчыкаў кніг.

Адной з праяў нашай нацыянальнай нядбаласці з'яўляецца той факт, што да гэтага часу мы чамусьці не прылічваем да беларускіх (слуцкіх) летапісаў так званы Радзівілаўскі (Кёнігсбергскі). Вось што сказана пра яго ў 21-ым томе трэцяга выдання Вялікай Савецкай Энцыклапедыі: «Радзівілаўскі (Кёнігсбергскі) летапіс — старажытнарускі летапісны звод, блізкі па зместу да Лаўрэнцьеўскага летапісу. Адносіцца да ўладзіміра-суздальскіх летапісаў. Дайшоў да нас у спісе канца 15 ст. (відаць, копія спісу 13 ст.), які належаў літоўскаму князю Б. Радзівілу, пазней бібліятэцы г. Кёнігсберг. У сярэдзіне 18 ст. паступіў у Пецярбургскую АН. Асаблівасць Радзівілаўскага летапісу — вялікая колькасць (617) маляўнічых мініяцюр, якія з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння матэрыяльнай культуры, палітычнай сімволікі і мастацтва Старажытнай Русі».

Аўтар артыкула ў Вялікай Савецкай Энцыклапедыі без усялякіх падстаў прылічвае Радзівілаўскі (Кёнігсбергскі) летапіс да ліку ўладзіміра-суздальскіх. Гэта, мякка кажучы, недакладнасць, бо князь Багуслаў Радзівіл, якому належаў гэты летапіс, быў не ўладзіміра-суздальскім, а слуцкім князем. У 1669 г. па завяшчанні памёршага Багуслава 450 найбольш каштоўных друкаваных і рукапісных кніг з яго бібліятэкі апынуліся ў Кёнігсбергскай бібліятэцы. Сярод іх, відаць, знаходзіўся і ілюстраваны летапіс, які ў сярэдзіне XVIII ст. з Кёнігсберга быў перададзены ці прададзены ў Пецярбургскую Акадэмію навук.

Мініяцюры з Радзівілаўскага (Кёнігсбергскага) летапісу — гэта цэлая галерэя твораў мастакоў канца XV ст. Яны даўно шырока выкарыстоўваюцца ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу ў акадэмічных выданнях Расіі і Украіны, але не ў нас.

В. А. Чамярыцкі і В. Ф. Шматаў выказалі меркаванне аб тым, што спіс Радзівілаўскага (Кёнігсбергскага) летапісу зроблены ў Смаленску або Полацку [1]. Узнікае пытанне: як ён трапіў са Смаленска або Полацка ў бібліятэку слуцкага князя?

Ужо адзначалася, што ў канцы XV стагоддзя ў Слуцку пры Трайчанскім манастыры працавала школа перапісчыкаў кніг. Спіс так званага Радзівілаўскага (Кёнігсбергскага) летапісу, відаць, быў зроблены ў майстэрні гэтай школы для бібліятэкі слуцкіх князёў Алелькавічаў, якая па спадчыне дасталася Багуславу Радзівілу.

## СЛУЦКІЯ ЛЕТАПІСЫ XVI СТ.

Пачатак XVI ст. на Случчыне азмрочваўся частымі набегамі крымскіх татар. Толькі ў 1502—1506 гг. яны пяць разоў з'яўляліся каля сцен горада і ў яго наваколлі. Барацьба ішла з пераменным поспехам, але татарам ні разу не ўдалося захапіць Слуцк. Гэтыя падзеі знайшлі адлюстраванне ў «Хроніцы польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсяе Русі» гісторыка Мацея Стрыйкоўскага, які ў апошняй чвэрці XVI ст. два гады знаходзіўся пры двары мясцовага князя і карыстаўся яго багатай бібліятэкай:

> Настася, княгіня Слуцкая, сваіх баяр
> Паслала перахапіць палахлівых татар.
> Шмат іх пад Капылём было забіта
> І горлам ля Пятровіч заплаціла мыта.

У 1508 г. князь Міхаіл Глінскі, які ўзначальваў паўстанне часткі феадалаў на Украіне і Беларусі, двойчы падыходзіў да Слуцка, але ўзяць яго яму не ўдалося.

---

[1] Энцыклапедыя Літаратуры і Мастацтва Беларусі: У 5 т. Т. 4. Мн., 1987. С. 450.

У тым жа годзе конныя атрады крымскіх татар зноў з'явіліся на тэрыторыі краю, але былі разбіты. Апошні напад татар на Случчыну адбыўся ў 1521 г.

У 1517 г. у горадзе пачалі весці запісы ў памінальнай кніжцы («Слуцкі памяннік»). Яны вяліся да XVIII ст. На асобных старонках запісвалі па сем'ях і родах імёны памерsituée слуцкіх і іншых князёў, гараджан, духавенства. Памінальнік аздоблены малюнкам. Зберaглося, як сцвярджае А. П. Грыцкевіч, усяго некалькі экземпляраў.

Ад першай паловы XVI ст. да нас дайшоў Слуцкі (Увараўскі) летапіс. М. М. Улашчык так расказвае пра гэтую хроніку: «Летапіс набыў ад настаўніка Успенскага І. П. Сахараў, які адзначыў, што Успенскі быў «з Літвы». Улічваючы тэрміналогію сярэдзіны XIX ст., калі Літвою апрача ўласна Літвы называлі ўсю заходнюю і цэнтральную Беларусь, можна думаць, што Успенскі выявіў рукапіс недзе ў раёне Слуцка. Сахараў памылкова лічыў, што набыты ім рукапіс з'яўляецца Супрасльскім. Ад Сахарава летапіс у 1847 г. перайшоў да А. С. Уварава»[1].

Калі пагадзіцца з М. М. Улашчыкам, што рукапіс летапісу мог быць выяўлены Успенскім недзе каля Слуцка, напрошваецца вывад, што захоўваўся ён і, відавочна, быў напісаны ў слуцкім Трайчанскім манастыры, дзе пісаліся ўсе слуцкія летапісы.

У 1839 г. на Беларусі была скасавана Брэсцкая унія. У 1840 г. са Слуцка ў Мінск пераязджае архіепіскап Антоній Зубко, рэзідэнцыя якога да таго размяшчалася ў Трайчанскім манастыры. Адбылося фактычнае перамяшчэнне праваслаўнай сталіцы Беларусі са Слуцка ў Мінск. Зубко быў паплечнікам Іосіфа Сямашкі, мітрапаліта, які шмат зрабіў для скасавання уніі на Белару-

[1] Улащик Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. С. 49.

сі і якога герой паэмы Максіма Танка Люцыян Таполя намаляваў у выглядзе чорта з рагамі...

Вось як Ф. Ф. Серна-Салаўевіч апісвае падзеі таго часу: «У першы год архіепіскапства (1840 г. — *Р. Р.*)... Антонія праваслаўны Слуцк адсоўваецца на задні план і ўступае сваю гісторыю губернскаму свайму гораду Мінску, куды ў верасні 1840 г. пераносіцца не толькі кафедра архіепіскапа з духоўнай кансісторыяй, але і Слуцкая духоўная семінарыя. Пачынаецца сістэматычнае разарэнне слуцкага Свята-Троіцкага манастыра: усе каштоўныя архірэйскія аблачэнні, шытыя золатам і аздобленыя жэмчугам... старажытныя іконы, бібліятэка адпраўлены ў Мінск»[1]. Гэта сапраўды так. Вось яшчэ факт. У Трайчанскім манастыры знаходзіўся беларускі цар-звон, які важыў 220 пудоў і 10 фунтаў. Гук ад гэтага звона быў чуваць больш чым за 10 кіламетраў ад Слуцка. У 1840 г. на яўрэйскіх падводах цар-звон таксама адправілі ў Мінск. Па дарозе яго разбілі. Пасля пераліўкі ён быў падвешаны на званіцы Петрапаўлаўскай царквы ў Мінску.

Хутчэй за ўсё менавіта тады, у верасні 1840 г., у час перавозу манастырскай бібліятэкі і іншых каштоўнасцей са Слуцка ў Мінск нехта выкраў Слуцкі летапіс і перадаў ці прадаў яго (апошняе верагодней) настаўніку Успенскаму. Пошукі даследчыкаў пакажуць, дзе быў выкрадзены Слуцкі летапіс: у Слуцку ці ўжо ў Мінску, калі туды была перавезена манастырская бібліятэка.

Я цалкам згодзен з М. М. Улашчыкам, што гэты летапіс трэба называць толькі Слуцкім і апускаць назву Увараўскі, «тым больш, што Увараўскімі названы яшчэ некалькі летапісаў».

Ад графа Уварава Слуцкі летапіс у рэшце рэшт трапіў у аддзел рукапісаў Дзяржаўнага Гістарычнага му-

---

[1] Серно-Соловьевич Ф. Ф. Древне-русский город Слуцк и его святыни. С. 18.

зея ў Маскве, дзе ён захоўваецца і сёння. У 1854 г. гісторык А. М. Папоў апісаў гэты дакумент і апублікаваў першыя 76 аркушаў пад назвай «Летапіс вялікіх князёў літоўскіх». У 1894 г. архімандрыт Леанід другі раз апісаў рукапіс і надрукаваў астатні яго тэкст (усяго ў рукапісе 106 аркушаў). У поўным выглядзе Слуцкі летапіс быў апублікаваны ў 1907 г. у 17-ым і ў 1980 г. у 35-ым тамах Поўнага збору рускіх летапісаў. У прадмове да 35-га тома М. М. Улашчык падрабязна апісаў Слуцкі летапіс. «Рукапіс... пісаны беларускім паўуставам, за выключэннем некалькіх аркушаў, адным і тым жа почыркам. Паперны знак — ціара. Першыя аркушы летапісу згублены...» [1].

Летапіс дзеліцца на дзве часткі. У першай гаворыцца пра падзеі, якія адбываліся ў Вялікім княстве Літоўскім у 1395—1446 гг. Тут між іншым расказваецца аб хрышчэнні мітрапалітам Фоціем слуцкага князя Сямёна Алелькавіча. Вось гэты запіс: «В лето 6928 (1420 г. — *Р. Р.*). Приехал митрополит Фотеи в Литву... Того же лета поиде митрополит Киеву и у Слуцку, крестиль князя Семена Александровича...» [2].

Варта адзначыць і такую асаблівасць першай часткі летапісу: запісы тут зроблены не ў строгай храналагічнай паслядоўнасці. Напрыклад, на 72-ім аркушы расказваецца пра падзеі 6953 г. (1445), а далей, на адвароце таго ж аркуша, гаворка ідзе пра 6885 г. (1377), калі памёр «князь великий Олгирд». І такіх фактаў не адзін-два... Гэта сведчыць аб тым, што складальнік ці некрытычна перапісваў матэрыял з нейкага аднаго летапісу, ці карыстаўся некалькімі крыніцамі, а папярэднюю сістэматызацыю матэрыялаў не зрабіў.

Змест першай часткі разнастайны, цікавы. Тут ёсць звесткі пра войны, пра царкоўнае і свецкае жыццё таго

[1] Полное собрание русских летописей. Т. 35. С. 6—7.
[2] Тамсама. С. 78.

часу. На літаратурнай мове адчуваецца ўплыў тагачаснай гутарковай мовы.

Другая частка летапісу ў сваю чаргу дзеліцца на дзве падчасткі, якія маюць загалоўкі «Летописецъ о великом князи московскомь, како далеки от роду Володимирова» і «Летописец от великого князя Володимира киевьского».

Гэтая частка ўяўляе цікавасць тым, што на аркушах 104 і 106 ёсць запіс, зроблены «дагары нагамі», у ім гаворыцца пра смерць слуцкага князя Юрыя. З запісу відаць, што жонкаю Юрыя Алелькавіча была княгіня Алена Мікалаеўна з роду Радзівілаў. Ёсць звесткі тут і пра паходжанне Алелькавічаў ад Гедыміна...

Час напісання летапісу (прыблізны) вызначыць цяпер не так і складана. М. М. Улашчык сведчыць, што паперны знак рукапісу — ціара, найбольш падобны з тым, які датуецца ў даследчыка паперных вадзяных знакаў Н. П. Ліхачова 1524 годам. Значыць, рукапіс створаны не раней 1524 г. У надпісе, які зроблены «дагары нагамі», ідзе гаворка пра падзеі 15 красавіка 1542 г. Гэта яскравае сведчанне таго, што да 15 красавіка 1542 г. летапіс быў ужо напісаны. Адсюль выснова: Слуцкі (Увараўскі) летапіс напісаны паміж 1524 і 1542 гг.

У другой палове XVI ст., як лічаць даследчыкі, была створана хроніка (летапіс) Быхаўца. Твор напісаны на старабеларускай мове. Ён з'яўляецца каштоўнай крыніцай звестак па гісторыі Беларусі і Літвы. Знойдзена хроніка ў 20-ыя гады XIX ст. у бібліятэцы памешчыка Быхаўца, ад імя якога і атрымала назву. Цалкам твор упершыню быў выдадзены ў 1846 г. у Вільні. Арыгінал не захаваўся. У 1966 г. хроніка выпушчана ў Маскве з прадмоваю і каментарыямі М. М. Улашчыка.

Аўтар расказвае аб гісторыі Вялікага княства Літоўскага ад легендарных часоў да першых гадоў XVI ст. Асаблівую цікавасць для нас уяўляюць старонкі, дзе прадстаўлены падзеі, што адбываліся ў пачатку XVI ст.

паблізу Слуцка і Навагрудка. Напісаны яны дасведчаным чалавекам. Адчуваецца, што аўтар добра знаёмы з гэтай мясцовасцю.

Сёння цяжка вызначыць, дзе канкрэтна была створана хроніка. Як вядома, яшчэ ў канцы XV ст. у Слуцкім Трайчанскім манастыры працавала школа перапісчыкаў кніг. Вучнямі, відаць, былі манахі. Пасля сканчэння школы яны раз'язджалі па манастырах, якія ў той час працавалі не толькі ў Слуцку, але і каля Клецка, Навагрудка, у Вільні. Нехта з выпускнікоў гэтай школы ці яго вучань, магчыма, быў аўтарам хронікі Быхаўца.

«Храніст, — лічыў Улашчык, — быў... блізкім да князя Сямёна Міхайлавіча Слуцкага. Апісваючы напады татар у 1502 г. на Слуцк, храніст піша, што князь убачыў татар, якія скакалі на горад і забівалі і хапалі жыхароў, тады, калі ён знаходзіўся ў замку ў царкве Святога Юр'я. Відавочна, што так мог напісаць чалавек, які быў побач з князем» [1].

Не абавязкова летапісец павінен быў стаяць побач, каб напісаць пра тое, як убачыў князь у сваім горадзе татар. Гэтыя звесткі ён мог атрымаць ад іншых людзей. Я больш схільны лічыць, што аўтар хронікі ў час напісання твора жыў у Навагрудку ці ў нейкім манастыры каля гэтага горада, але ў мінулым некаторы час знаходзіўся ў Слуцку і добра ведаў яго. Не выключана, што ён працаваў і ў манастыры, які размяшчаўся ў цяперашняй вёсцы Цапра каля Клецка. Аб гэтым сведчыць добрае веданне ім тамтэйшай мясцовасці і назваў паселішчаў.

Трэба мець на ўвазе, што ў XV—XVI і XVII стст. паміж Слуцкам і Навагрудкам існавалі цесныя сувязі. Не выпадкова пры адміністрацыйнай рэформе 1566 г. Слуц-

---

[1] **Хроника Быховца. М., 1966. С. 28.**

кае княства было ўключана як асобная адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў Навагрудскі павет.

«Храніст, — пісаў М. М. Улашчык, — ставіць Навагрудак так высока, што калі (па яго расказу) князь Нарымунт перанёс сталіцу з Навагрудка ў Кернаў, у Літву, то ён стаў тытулавацца князем Навагрудскім, Літоўскім і Жэмайцкім. Як бачым, тытул князя Навагрудскага быў пастаўлены вышэй князя Літвы... Такая «версія» магла быць створана толькі ў Навагрудку. Такім чынам, меркаванне... што ў Навагрудку вялося летапісанне, атрымлівае дадатковае пацвярджэнне»[1]. Несумненна адно: хроніка Быхаўца мае прамую ці ўскосную сувязь са школай перапісчыкаў кніг, якая працавала ў слуцкім Трайчанскім манастыры ў канцы XV ст.

Каб хроніка Быхаўца пісалася ў Слуцку і для патрэб яго, наўрад ці аўтар называў бы мясцовага князя Сямёнам Міхайлавічам Слуцкім. Ён назваў бы яго Сямёнам Міхайлавічам Алелькавічам ці неяк інакш, але без слова Слуцкі. Відавочна, што ў школе перапісвалі кнігі не толькі для патрэб Слуцка. Іх маглі пісаць па заказу магнатаў і прадаваць ці дарыць за межы Случчыны. Адной з такіх кніжак, на маю думку, быў і Радзівілаўскі (Кёнігсбергскі) летапіс. Ён хутчэй за ўсё створаны як падарунак ці па заказу князёў Алелькавічаў для іх бібліятэкі. Таму і летапіс, лічу, трэба называць летапісам Алелькавічаў, бо Радзівілам ён дастаўся, відаць, у спадчыну. Магла быць напісана ў Слуцку і хроніка Быхаўца па заказу нейкага магната з Навагрудка. Каб дагадзіць заказчыку, храніст зрабіў акцэнт на навагрудскім патрыятызме. Не выключана, што хроніка створана праваслаўнымі манахамі для нейкай свецкай асобы.

---

[1] Хроника Быховца. С. 25—26.

## У ЧАСЫ РЭФАРМАЦЫІ

З другой паловы XVI ст. у гісторыі літаратуры і культуры краю пачынаецца адзін з багацейшых на падзеі перыяд. У гэты час у Слуцк з'ехаліся пратэстанты і ерэтыкі, сярод якіх былі пісьменнікі і педагогі Сымон Будны, Арцемій, Марк Сарыхозін і інш.

Чаму менавіта ў гэтым горадзе знайшлі сабе прыстанішча многія з тых, каго гнала контррэфармацыя з захаду і рэакцыя рускай праваслаўнай царквы з усходу? Для адказу на пытанне дастаткова паглядзець на карту тагачаснай Беларусі. У XVI—XVIII стст. уся тэрыторыя была падзелена на ваяводствы і паветы, толькі Случчына заставалася княствам і хоць фармальна ўваходзіла ў склад Навагрудскага павета, мела адносную самастойнасць. Гэта была аўтаномная адзінка, на тэрыторыі якой дзейнічалі свае законы і парадкі. Напрыклад, у Слуцкім княстве фактычна ігнаравалі Брэсцкую унію. Вобразна кажучы, «незалежная» Беларусь у другой палове XVI—XVIII ст. была сціснута да памераў Слуцкага княства.

«Слуцк — адзіны з гарадоў Паўночна-Заходняга краю, — гаворыцца ў «Гістарычна-статыстычным апісанні цэркваў і прыходаў Мінскай епархіі (Мн., 1879. Т. 3), — які на працягу двух стагоддзяў цярпліва вытрымліваў увесь прыгнёт каталіцызму і быў моцным бастыёнам праваслаўя, захаваўшы цэльнасць, чысціню і недатыкальнасць яго... Такою нязменнаю цвёрдасцю ў праваслаўі Слуцк абавязаны многім манастырам і цэрквам...» [1].

Адкінем у бок афіцыйную для таго часу назву Беларусі «Паўночна-Заходні край», нададзеную ёй царом Мікалаем I, і глянем на сутнасць справы.

---

[1] Цыт. па: Серно-Соловьевич Ф. Ф. Древне-русский город Слуцк и его святыни. С. 4.

Карыстаючыся пэўнай аўтаноміяй, Слуцк быў ледзь не адзіны з гарадоў Беларусі, што на працягу ўсяго існавання Рэчы Паспалітай вытрымліваў націск уніі і каталіцызму. Ён з'яўляўся асяродкам старажытнай беларускай культуры, якая захавалася тут у больш некранутым, чым у іншых рэгіёнах, выглядзе. І не толькі захавалася, але развівалася і ўзбагачалася. Вобразна кажучы, яна адступіла тады на Случчыну, сціснулася ў спружыну і чакала спрыяльнага часу, калі зможа разгарнуцца і перайсці ў наступ, вярнуць страчанае. Зразумела, такія-сякія поспехі каталіцызм і уніяцтва мелі і на Случчыне, але яны не змянілі стану рэчаў.

У 1554 г. на царкоўным саборы быў асуджаны і адлучаны ад царквы ігумен Троіца-Сергіева манастыра Арцемій, адзін з ідэолагаў руху несцяжацеляў — рэлігійна-палітычнай плыні ў Расіі канца XV — пачатку XVI ст. Ён выступаў як праціўнік царкоўных багаццяў і існуючай няроўнасці, якая, на яго думку, падрывала маральны аўтарытэт царквы. Быў сасланы ў Салавецкі манастыр, а ў 1555 г. уцёк з высылкі і прыбыў у Слуцк, дзе, па словах рускіх гісторыкаў, стаў «рэўнасным абаронцам праваслаўя». У Слуцку Арцемій займаўся літаратурнай дзейнасцю і кіраваў гуртком сваіх паслядоўнікаў. Тут ён напісаў 14 пасланняў, у большасці якіх выказваўся супраць рэфармацыйнага руху ў Вялікім княстве Літоўскім. Выступаў ён і супраць Сымона Буднага. Пасля смерці Арцемія ў 70-ыя гады XVI ст. эстафету ад яго прыняў уцякач з Масквы Марк Сарыхозін, вучань зацятага праваднікa несцяжацельства.

У другой палове XVI ст. на Случчыне некаторы час працаваў прапаведнікам беларускі гуманіст і асветнік, філосаф, літаратар, рэлігійны рэфарматар Сымон Будны — адна з самых светлых галоў свайго часу, а ў апошняй чвэрці стагоддзя два гады жыў і працаваў Мацей Стрыйкоўскі. Князю Юрыю Слуцкаму, які прадставіў паэту і гісторыку сваю бібліятэку, ён прысвяціў хро-

ніку «Пра пачатак, паходжанне, мужнасць, рыцарскія і грамадзянскія справы слаўнага народа літоўскага, жамойцкага і рускага».

Ускосныя дадзеныя сведчаць, што ў горадзе ў другой палове XVI ст. працавала школа, якая давала вучням дастатковую падрыхтоўку да паступлення ва універсітэты Заходняй Еўропы. А. П. Грыцкевіч называе случчан Івана Родзіча, Канстанціна Запольскага і Якава Слуцкага, што вучыліся ў той час у Кёнігсбергскім універсітэце. У пачатку 80-ых гадоў XVI ст. у Баварыі праходзілі курс навук князь Аляксандр і 15 маладых людзей, якія яго суправаджалі.

У 1580 г. князь Юрый Юр'евіч падараваў Трайчанскаму манастыру пастырскі посах, выліты з чыстага срэбра, з надпісам такога зместу: «Юрій Юріевічь Олелько Княжя Слуцкое (1580 г.) до светое Тройце — Архімандріи Слуцкое для вечное памети и богомолля благочестія светого» і срэбраную пазалочаную чашу (патирь) з упрыгожаннямі і надпісамі па ніжэйшым вобадзе: «Юрій Юріевіч Олелько, княжа Слуцкое до Монастыря Св. Тройцы архімандрій Слуцкой 1580 г.» і «Чатырох'евангелле», уласнаручна ім перапісанае. У дарэвалюцыйны час евангелле захоўвалася ў манастыры. Часопіс «Наш край» у першым нумары за 1928 г. паведамляў, што яно знаходзіцца ў Дзяржаўным музеі БССР. Куды гэтая каштоўнасць падзелася адтуль у час вайны, невядома. У кнізе Ф. Ф. Серна-Салаўевіча змешчаны фотаздымак «Чатырох'евангелля» і яго апісанне: «Рукапіснае чатырох'евангелле работы... князя Юрыя Юр'евіча Алелькі, у 1/2 аркуша; работа — верх мастацкай дасканаласці. Першыя літары кожнага евангелля ўяўляюць з сябе цудоўныя малюнкі акварэллю — блакітная з зялёнаю фарбы, з золатам; тэкст напісаны чарнілам; друкаваныя літары славянскага алфавіту, на выгляд як быццам зроблены механічным друкарскім спосабам; агаворкі ці адзнакі евангелля для чытання

на пэўнае Свята ці выпадак знізу старонкі напісаны золатам, а зачыны адзначаны на палях кінаварам; апрача таго, пры першым раздзеле кожнага евангелля маецца асобны ў пачатку старонкі малюнак... Евангелле гэта пераплецена ў дошкі, абкладзеныя бархатам, без усялякіх знешніх упрыгожанняў»[1].

Не раней як у маі 1580 г., пасля смерці князя Юрыя, яго духоўнік «мнагагрэшны поп Малахвей» (такое ён сам сабе даў вызначэнне) напісаў да евангелля прадмову на старабеларускай мове. Вось яе змест: «Не чудисе благоразсудительное читателю — сее светое Евангеліе которое сам Светое памети Юрій Юрьевічъ Олелько княжа Благочестивое Слуцкое року Божого 1580 самъ своею рукою власною переписавъ, что починает золотомъ, а даліе простимъ чернилом и минньею (тушшу. — *Р. Р.*), бо тое учинилосе не отъ скупости, але отъ ревности великой ко благочестию светому, дабы такое переписано скоро до скутку (да канца.— *Р. Р.*) своего прійшло, а знову утаеваючи праци свои и кошти предъ человеки; тое тотъ князь учинивъ як мнемо часто тамъ бывали, и видели и слышали, а наивенцей что уже и хороба приближалася; турбація Речи Посполитой укоротили жизнь тое княжети — умер, погребенъ въ Слуцку, въ Соборной Успеніе Пресвятыя Богоматере церкви у правого крилося положен. Сведчимъ многогрешный попъ Малахвей. Светое Варвары въ Слуцку церкви, княжети с. п. духовный отецъ»[2].

Не думаю, што трэба рабіць пераклад гэтай прадмовы. «Турбацыя Рэчы Паспалітай скараціла жыццё князя», — гаворыць яе аўтар. І гэтаму можна верыць, бо ў той час ішла падрыхтоўка да Брэсцкай уніі. Турбот князю Юрыю хапала, ён думаў пра лёс княства...

---

[1] Серно-Соловьевич Ф. Ф. Древне-русский город Слуцк и его святыни. С. 35.

[2] Тамсама.

Князь Юрый Юр'евіч Алелькавіч быў першы слуцкі мастак, імя якога да нас дайшло, а яго духоўны бацька поп Малахвей — першы слуцкі пісьменнік, ад якога да нас дайшло імя і адзіны твор — «Прадмова да евангелля». Магчыма, Малахвей больш ніякіх твораў не напісаў, але і адной яго «Прадмовы» дастаткова, каб гэтае імя не было забыта.

## *АД АЛЕЛЬКАВІЧАЎ ДА РАДЗІВІЛАЎ*

Пасля смерці князя Юрыя Юр'евіча і яго двух братоў усе іх уладанні атрымала ў спадчыну непаўналетняя князёўна Софія Алелькавіч. У гэты час разгарэлася жорсткая барацьба паміж магнатамі Хадкевічамі і Радзівіламі за Случчыну.

У 1600 г. князёўна Софія дала згоду выйсці замуж за Януша Радзівіла, але з умоваю, што дзеці ад шлюбу будуць праваслаўнымі. Зразумела, што ўмову выпрацавала не сама шаснаццацігадовая князёўна. За яе спіною стаялі праваслаўныя вярхі тагачаснай Случчыны, якія Брэсцкую унію не прынялі. Пазіцыі праваслаўя тут былі моцныя.

Януш Радзівіл прыняў умову Софіі Алелькавіч і стаў яе мужам. Па веравызнанні ён быў кальвіністам і, відаць, падзяляў погляды свайго бацькі Крыштофа Радзівіла, празванага Перуном, — той выступаў супраць Брэсцкай уніі.

Софія дабілася ад караля Рэчы Паспалітай спецыяльнай граматы, па якой забаранялася на Случчыне пераатвараць праваслаўныя цэрквы і манастыры ва уніяцкія. У 1612 г., нарадзіўшы мёртвую дачку, князёўна памерла. Драўляная дамавіна з яе мошчамі, устаўленая ў цынкавую, да рэвалюцыі захоўвалася ў Трайчан-



31. зак. 2

скім манастыры, а пасля рэвалюцыі і да Вялікай Айчыннай вайны ў медыцынскім музеі Мінска, зараз у Мінскім кафедральным саборы Святога Духа. Софія лічылася «блажэннаю», заступніцаю ўсіх хворых жанчын, але афіцыйна ў той час кананізаваная не была.

У канцы 1986 г. я наведаў у Гародні саборную царкву. Мне хацелася паглядзець на раку з мошчамі дзіцяці Гаўрыіла, якая з 1755 г. і да пачатку 30-ых гадоў нашага стагоддзя таксама захоўвалася ў галоўным храме слуцкага Трайчанскага манастыра. Мне паказалі раку, але саміх мошчаў я не бачыў — ключа не знайшлося. З гутаркі з настаяцелем храма між іншым высветлілася, што слуцкая княгіня Софія цяпер лічыцца святою. Пацверджанне гэтага я потым знайшоў у царкоўным календары за 1986 г.

Пасля смерці Софіі з роду Алелькавічаў Слуцкае і Капыльскае княствы перайшлі да Радзівілаў. Януш ажаніўся другі раз. У 1620 г. ён памёр і Слуцкім княствам стаў кіраваць яго брат Хрыстафор. З 1640 г., калі сканаў Хрыстафор, княжыў сын Януша Багуслаў. Ён памёр у 1669 г., пакінуўшы свае ўладанні двухгадовай дачцэ Караліне, якая пазней выйшла замуж за прынца брандэнбургскага, потым пфальцграфа Нейбургскага. Караліна адышла «ў іншы свет» у 1695 г. Уладанні атрымалі яе дочкі, прынцэсы нейбургскія. Случчыну яны ніколі не бачылі... Так з канца XVII ст. край апынуўся фактычна ва ўласнасці нямецкіх магнатаў. У 1744 г. яго выкупілі Радзівілы нясвіжскага калена.

## *САЛАМОН РЫСІНСКІ*

Калі нарадзіўся Саламон Фёдаравіч Рысінскі, дакладна невядома. Вучоныя мяркуюць, што здарылася гэта ў 60-ыя гг. XVI ст. у вёсцы Рысін на Полаччыне (цяпер Себежскі раён Пскоўскай вобласці). Памёр

пісьменнік у Дзяляцічах (цяпер Навагрудскі раён) у 1625 г.

Да апошняга часу Рысінскі быў забыты ў Беларусі. Звестак пра яго няма нават у БелСЭ. А між тым гэта буйны паэт, мысліцель і гуманіст эпохі Адраджэння. Як і Сымон Будны, ён спадзяваўся на справядлівых манархаў, меркаваў, што яны зразумеюць неабходнасць перабудовы грамадства, народнай асветы. Калі Сымон Будны і многія іншыя дзеячы таго часу былі рэлігійнымі асобамі і разбуралі багаслоўе знутры, то Саламон Рысінскі, ледзь не адзіны філосаф і гуманіст таго часу, які ўсё жыццё заставаўся свецкім чалавекам.

«Творчая спадчына С. Рысінскага, — піша даследчык Я. І. Парэцкі, — які ад гуманіста-каментатара і даследчыка антычнай літаратуры, выкладчыка старажытных моў змог узняцца да вяршынь гуманізму — выяўлення ў народнай мове роднага краю вытокаў мудрасці, да апошняга часу амаль не даследавалася... Даць сёння аналіз творчасці Рысінскага і выдаць яго творы — гэта значыць вярнуць Беларусі імя аднаго з аўтараў выдатных помнікаў культуры мінулага» [1]. З горыччу можна сказаць, што і сёння на беларускай мове пра Рысінскага бадай нічога яшчэ не пісалася, і творы яго не перакладаліся, а значыць, і імя гэта яшчэ не поўнасцю вернута Беларусі...

У адзіным даследаванні, прысвечаным мысліцелю, якое выдадзена ў Беларусі, — у кнізе Я. І. Парэцкага «Соломон Рысинский» даволі падрабязна аналізуецца творчасць паэта, падаюцца фрагменты з яго твораў, а асобныя невялічкія надрукаваны поўнасцю ў перакладах з лацінскай на рускую мову.

Сярод пісьменнікаў Беларусі канца XVI — пачатку XVII ст. Саламон Рысінскі быў найбольш арыгінальным пісьменнікам-філосафам, творчасць якога вылучалася

[1] Порецкий Я. И. Соломон Рысинский. Мн., 1983. С. 6.

надзвычай вялікай разнастайнасцю жанраў і напрамкаў. Ён займаўся тэорыяй літаратуры, каменціраваў класічных рымскіх пісьменнікаў Авідзія, Плаўта, Клаўдзіяна, паэта Аўсонія. Рысінскі аналізаваў пісьмы Л. А. Сенекі, перакладаў са старажытных моў і на старажытныя, пісаў эпісталярныя творы.

«Рысінскі бачыў у паэце, перш за ўсё, майстра слова, працаўніка, якому даводзіцца вучыцца свайму майстэрству, перапраўляць створанае, быць гатовым успрымаць крытыку... Рысінскі стварыў своеасаблівую школу паэтыкі, дамагаўся дасканаласці формы і зместу. З асаблівай едкасцю высмейваў лжэпаэтаў і лжэвучоных» [1].

У 1587 г. у Альтдорфе (Германія), дзе ён, дарэчы, вучыўся ва універсітэце, Рысінскі выдаў «Дзве кніжкі пісьмаў Саламона Пантэра». Адзіны экземпляр гэтай працы цяпер захоўваецца ў Гамбургу. Але галоўным яго творам з'яўляецца зборнік прыказак, які выйшаў у Любчы ў 1618 г. і пасля неаднаразова перавыдаваўся (напрыклад, у 1854 г. было 8-ае выданне). Гэта практычна першае ў нашай краіне выданне падобнага роду, а Рысінскага мы маем падставу называць першым збіральнікам фальклорных твораў у Беларусі. Ён, паводле слоў Я. І. Парэцкага, чуў народную мудрасць на беларускай, запісваў на польскай і тлумачыў на лацінскай мове. Каля 500 прыказак з 1800, якія былі змешчаны ў першым выданні, і цяпер захаваліся на Беларусі.

Збіраннем прыказак Рысінскі пачаў займацца раней, чым убачыў свет зборнік, які ён выдаў, калі жыў і працаваў у Слуцку. Няма сумнення, што многія прымаўкі ім запісаны ў Слуцку і Нясвіжы. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, параўнанне іх з тымі, што запісаны беларускім савецкім мовазнаўцам Ф. М. Янкоўскім і іншымі збіральнікамі фальклору ў паўднёвай Беларусі.

---

[1] Порецкий Я. И. Соломон Рысинский. С. 52.

Крыху раней, у 1614 г., Рысінскі выдаў зборнік панегірычных вершаў, дзе былі творы двух жанраў — эпітаме, у якіх ён услаўляў дзеянні Радзівілаў у час Лівонскай і іншых войнаў, і эпітафіі.

Каб чытач меў уяўленне аб вершах С. Рысінскага, прывядзем урывак з яго твора «Кірмпенсіум», дзе расказваецца аб удзеле ў вайне князя Радзівіла і яго войска. У ім бачым мы рэалістычныя карціны таго часу. Верш перакладзены з лацінскай на рускую мову Я. І. Парэцкім.

Царь разоряет ливонцев, теснит их мечом и железом,
Опустошенные травит жилища жестоким огнем...
Дерзость такую его не стерпеть. Не допустит на берег
Князь Радзивилл знаменитый, литовской отчизны глава...
Войско литовцев призывная песня на бой вдохновляет,
Вал — нипочем, неприступные стены из дуба.
Заступы, лестницы, ломы неся, чтоб на стены подняться,
Воинам мигом пришлось под горящей смолой проскочить.
Вскоре от сильных ударов секир уже рушатся бревна,
Не помогает обивка железная мощных ворот.
Крепость взята, опрокинута царская грозная сила.
Старцы и юноши — воины вместе с вождями в плену... [1].

Сярод гэтых вершаў асаблівую цікавасць уяўляе эпітафія, прысвечаная Слуцкай княгіні Софіі. Вось фрагмент з жалобнай песні, як назваў яе Рысінскі:

О! Ненадежной судьбы мановение неоспоримо!
О! Никому не избегнуть плачевного жизни конца!
Смерть презирает и прадедов честь, и родителей дело,
Племени блеск уважать не умеет и разума мощь... [2]

Пасля філасофскага ўступу паэт пераходзіць да характарыстыкі гераіні:

Звездочка! Ты сохранилась в созвездии Слуцком едина
Между литовскими славой ярчайшая, первая дочь!
Разве ты менее рыцарь, чем гордый супруг твой великий?
Сила какая, нагрянув нежданно, тебя унесла?.. [3]

---

[1] Порецкий Я. И. Соломон Рысинский. С. 66—67.
[2] Тамсама. С. 67.
[3] Тамсама.

Далей Рысінскі гаворыць пра пакуты мужа, які страціў жонку:

Сломлено не было мужество князя ни вражеским строем,
Ядрами, сталью, огнем и угрозами он не сражен,
Меч не поверг или копий ужасных нещадные жала,
Тлением не испугала в глазах промелькнувшая смерть.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Разве печали враждебная сила доспехи пронзит?..[1]

Будзем спадзявацца, што з цягам часу чытачы будуць мець магчымасць прачытаць на роднай мове творы С. Рысінскага, і такім чынам творчасць выдатнага паэта XVI — першай палавіны XVII ст. зробіцца нарэшце здабыткам сучаснага беларускага чытача.

Тут дарэчы адзначыць, што Рысінскі, відаць, першы пісьменнік, які называў сябе беларусам. Вось што гаворыць наконт гэтага Я. І. Парэцкі: «...У... актах Альтдорфскага універсітэта за 2 снежня 1586 года Саламон Рысінскі запісаны «Solomo Pantherus Leucorussus» (Саламон Пантэрус беларус — «леукос» па-грэчаску — *белы)»*[2].

Запіс у актах Альтдорфскага універсітэта дае падставу зрабіць выснову аб прыблізным годзе нараджэння паэта. Ён, відаць, зроблены ў той час, калі Рысінскі ці паступаў ва універсітэт ці яго канчаў. Яму тады было недзе 20—23 гады. Значыць, нарадзіўся ён прыблізна ў 1563—1566 гг., магчыма, крыху раней ці крыху пазней.

У Саламона Рысінскага была багацейшая для свайго часу бібліятэка, у якой меліся творы грэчаскіх і рымскіх філосафаў і пісьменнікаў, кніжкі яго сучаснікаў па геаграфіі, педагогіцы, заалогіі, батаніцы, архітэктуры, матэматыцы і іншых навуках. Прааналізаваўшы вопіс кніг з яе і супаставіўшы з вядомымі зборамі таго часу, Я. І. Парэцкі небеспадстаўна гаворыць: «...Бібліятэку

[1] Порецкий Я. И. Соломон Рысинский. С. 67.
[2] Тамсама. С. 8.

Рысінскага, у якой было больш за тысячу кніжак... можна аднесці да ліку каралеўскіх». Тым не менш, маючы багацейшы для свайго часу збор, паэт жыў у нястачы. Пасля смерці Рысінскага, акрамя кніжак, ад яго нічога не засталося.

Я. І. Парэцкі адзначыў, што Саламон Рысінскі дапамагаў князю Радзівілу засноўваць школу ў Слуцку. На жаль, даследчык не паказаў, у чым канкрэтна заключалася гэтая дапамога. Не толькі ж на той падставе ён робіць такую выснову, што Рысінскі па даручэнні Віленскай пратэстанцкай суполкі перакладаў псалмы.

## *ПЕДАГОГІ І ІХ ВЫХАВАНЦЫ*

Разам з Рысінскім на службе ў князёў Радзівілаў знаходзіўся яго сябар Даніла Набароўскі (1573—1640), паэт і ўрач. Ён быў на некалькі гадоў маладзейшы за Рысінскага. У 1590—1593 гг. вучыўся ў Вітэнбергскім універсітэце, у 1602 г. у Падуі слухаў лекцыі Галілея. Значыць, у Слуцку і Нясвіжы Даніла Набароўскі з'явіўся пазней за Рысінскага — недзе пасля 1602 г.

Ёсць падставы меркаваць, што менавіта з дапамогаю гэтых асветнікаў у 1617 г. у Слуцку з'явіліся выдатныя педагогі Рэйнгальд Адамі і Андрэй Музоній. Першы з іх хутчэй за ўсё паходзіў з Германіі. Яго мог рэкамендаваць на выкладчыцкую пасаду ў Слуцкую кальвінісцкую школу С. Рысінскі, які меў у Германіі шмат знаёмых. Музоній, верагодна, быў з Італіі і сваім з'яўленнем у Слуцку абавязаны Д. Набароўскаму.

Засноўваючы ў 1617 г. у Слуцку кальвінісцкую навучальную ўстанову, Януш Радзівіл, вядома, хацеў, каб у яго школе працавалі лепшыя педагогі. А дзе іх было ўзяць? Ён мог звярнуцца з такім пытаннем да прыдворных паэтаў С. Рысінскага і Д. Набароўскага, адукаванейшых людзей свайго княства, і яны падказалі най-

больш падыходзячыя кандыдатуры. Адамі і Музонія запрасілі... Так яно, відаць, і было ў сапраўднасці, бо хто ў Слуцку тады лепш за Рысінскага і Набароўскага ведаў Захад?..

Слуцкая ж кальвінісцкая навучальная ўстанова ўжо ў XVII ст. заваявала вядомасць і славу далёка за межамі Беларусі як «Слуцкія Афіны», як «узорная Слуцкая гімназія». І яна змагла зрабіць гэта толькі таму, што каля яе калыскі стаялі выдатныя педагогі свайго часу.

Калі хто з чытачоў зацікавіцца гісторыяй старажытнай навучальнай установы, ён можа прачытаць аб ёй у кнізе І. Глебава «Историческая записка о Слуцкой гимназии 1617—1630—1901 года» (Вільня, 1903 г.) і ў выданні аўтара гэтай кнігі «Старэйшая школа Беларусі» (Мн., 1985.)

У 1986 г. у маскоўскім выдавецтве «Педагогика» выйшла «Антология педагогической мысли Белорусской ССР» — кніга своечасовая, патрэбная, але з некаторымі хібамі. На 15-ай старонцы яе чытаем: «У школах, якія ўзніклі на грэбні рэфармацыйнай хвалі, выкладанне вялося інакш, чым у традыцыйных сярэдневяковых. Іншым быў сам прынцып навучання, які прадугледжваў адмаўленне ад зубрэння, зварот да прыроды, павагу да асобы вучня, цярпімасць у справах рэлігіі. Агульным для абодвух тыпаў школ (рэфармацыйных і брацкіх. — *Р. Р.*) было непрыняцце каталіцка-езуіцкіх прынцыпаў выхавання і адукацыі. У гэтых школах знаходзілі прызнанне перадавыя педагагічныя ідэі, у прыватнасці меў месца ўплыў выдатнага чэшскага педагога Я. А. Каменскага.

Уплыў перадавых педагагічных ідэй адчуваецца ў творах Сымона Буднага, Яна Ліцынія Намыслоўскага, педагогаў Слуцкай кальвінісцкай школы».

Сапраўды рэфармацыйныя і брацкія школы працавалі інакш, чым каталіцка-езуіцкія, але ўплыву перадавых ідэй Яна Амоса Каменскага ў пачатковы перыяд

свайго існавання яны адчуваць не маглі. Рэфармацыйныя арыянскія школы ўзніклі ў Беларусі ў другой палове XVI — пачатку XVII ст. Ян Ліцыній Намыслоўскі, напрыклад, стаў выкладчыкам у Іўі ў 1585 г. Я. А. Каменскі ж у 1592 г. яшчэ толькі нарадзіўся і, зразумела, ні Сымон Будны, ні Намыслоўскі не маглі адчуць уплыў яго ідэй. Слуцкая кальвінісцкая школа заснавана ў 1617 г., калі Каменскі меў усяго 25 гадоў ад роду і быў яшчэ мала каму вядомым настаўнікам.

Усё, відаць, якраз наадварот: не Сымон Будны, не Ян Ліцыній Намыслоўскі і не слуцкія педагогі адчувалі на сабе ўплыў Яна Амоса Каменскага, а сам Каменскі знаходзіўся пад уплывам іх перадавых ідэй.

У пачатку XX ст. нямецкі даследчык Д. Дальтон знайшоў у Лешна, дзе некалі працаваў Каменскі, у архіве яго запіс. У ім высока ацэньваўся аўтарытэт слуцкіх педагогаў. Але Дальтону не ўдалося адшукаць статут Слуцкай школы і дапаможнікі для вучняў, створаныя ў Слуцку, і ў яго, такім чынам, не было матэрыялаў, якія ён мог бы параўнаць з творамі славутага чэшскага педагога. Статут Слуцкай школы, выдадзены ў 1628 г., толькі ў наш час адшукаў у Ленінградзе Я. І. Парэцкі, а дапаможнік па рыторыцы для слуцкіх гімназістаў знайшла ў Кракаве Ю. І. Прэнская. З гэтых дакументаў відаць, што слуцкія педагогі кіраваліся ў сваёй дзейнасці многімі ідэямі, якія пазней развіў Каменскі.

Настаўнікі Андрэй Дабжанскі, Андрэй Музоній, Рэйнгальд Адамі і іншыя заснавальнікі Слуцкай школы — аўтары статута і дапаможнікаў — былі педагогамі еўрапейскага ўзроўню. Па дапаможніку па рыторыцы, створаным Рэйнгальдам Адамі, пазней вучыўся Ламаносаў. На жаль, статут і «Кампендыум па рыторыцы» (кароткі дапаможнік) на беларускую мову ўсё яшчэ не перакладзены. Фрагменты з іх змешчаны ў «Антологии педагогической мысли Белорусской ССР». Даўно

пара пазнаёміць беларускага чытача з гэтымі нацыянальнымі каштоўнасцямі.

Цікавы факт: каб заахвоціць вучняў лепш і глыбей ведаць лацінскую мову, якая тады з'яўлялася мовай навукі, на працягу 250 гадоў у Слуцкай школе за дадатковае вывучэнне лацінскіх тэкстаў вучні атрымлівалі піва. Гімназіст за дзень мог зарабіць дзве шклянкі.

У 1625 г. у Любчы быў выдадзены зборнік вершаў на лацінскай мове, якія напісалі навучэнцы Слуцкай школы. На жаль, пакуль што ніводны з гэтых твораў на беларускую мову не перакладаўся.

Не будзем тут пералічваць усіх выхаванцаў Слуцкай гімназіі, якія потым сталі шырока вядомымі. Назавём толькі некалькі імён былых вучняў гэтай школы. Іх павінен ведаць кожны адукаваны чалавек.

Ілья Капіевіч (каля 1651—1714). Асветнік, кнігавыдавец, паэт. Удасканаліў кірыліцу.

Зарыян Якаўлевіч Даленга-Хадакоўскі (Адам Чарноцкі) (1784—1825). Пачынальнік беларускай, польскай, рускай і ўкраінскай археалогіі.

Вітольд Карлавіч Цяраскі (1849—1925) скончыў Слуцкую гімназію з сярэбраным медалём. Выдатны спецыяліст у галіне астрафотаметрыі, член-карэспандэнт Пецярбургскай Акадэміі навук, дырэктар абсерваторыі Маскоўскага універсітэта. Ён вымераў зорную велічыню Сонца і вызначыў ніжнюю мяжу яго тэмпературы.

Сымон Арыевіч Козберг (1903—1965) — канструктар рухавікоў апошняй ступені ракеты-носьбіта, якая вынесла Юрыя Гагарына ў космас. У дні, калі С. А. Козберг трагічна загінуў у аўтакатастрофе, адзін амерыканскі часопіс адзначыў: «Са смерцю Козберга Расія страціла другога Цыялкоўскага». Імем Козберга названы адзін з кратэраў на адваротным баку Месяца.

Сярод выпускнікоў Слуцкай гімназіі варта ўспомніць заснавальніка першай у Расіі клінікі па хваробах скуры Генрыха Кулакоўскага (гады жыцця невядомы),

пісьменнікаў Адама Плуга (1823—1903), Альгерда Абуховіча (1840—1898), Язэпа Дылу (1880—1973), выдатнага адваката К. А. Петрусевіча (1872—1949), акадэміка жывапісу К. І. Карсаліна (1809—1872).

Зразумела, былі сярод выпускнікоў і рэакцыянеры тыпу Сухазанета, міністра абароны Расіі першай паловы XIX ст. Але сухазанетаў былі адзінкі, а выдатных вучоных, пісьменнікаў, мастакоў, палкаводцаў, якія выйшлі са сцен Слуцкай школы, — дзесяткі.

## *СЛУЦКІ «ДЫЯРЫУШ»*

У бібліятэцы Чартарыскіх у Кракаве захоўваецца слуцкая хроніка, якая мае назву «З дыярыуша (дзённіка) горада Слуцка». Гэта апошні твор летапіснага характару ў гісторыі горада. Напісаны ён на польскай мове невядомым аўтарам.

У дзённіку расказваецца пра двухразовую няўдалую асаду Слуцка рускім войскам у верасні 1655 г., пералічваюцца мерапрыемствы, праведзеныя магістратам для забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання перад асадай. Напрыклад, вось такое: было вырашана прадаваць хлеб толькі слуцкім мяшчанам і нікому іншаму.

Перад прыходам рускіх войск вакол горада насыпалі вал. 2 верасня войскі князя Трубяцкога падышлі з паўднёвага боку да Слуцка, да Трайчанскага манастыра. Раніцаю 3 верасня яны пачалі абстрэл горада. Абаронцы адказалі агнём. 6 верасня, нічога не дабіўшыся, руская армія зняла асаду і рушыла ў бок Нясвіжа.

Другі раз яна падышла да Слуцка сумесна з атрадам казакаў у 5 тысяч чалавек. Трубяцкой спецыяльным пісьмом прапанаваў жыхарам горада і камандаванню гарнізона здацца, але атрымаў адказ, што не пісьмом,

MONARCHIA
TVRECKA,
OPISANA
Przez
RICOTA
SEKRETARZA POSŁA ANGIELSKIEGO.
V PORTY
OTTOMANSKIEY
RESIDVIACEGO.

Z FRANCVSKIEGO IĘZYKA NA POLSKI
PRZETLUMACZONA.

PRZEZ
SZLACHCICA POLSKIEGO.
[illegible]
W SŁVCKV.

П. Рыко. «Турэцкая манархія»

а крывёю трэба здабываць Слуцк. Князь не рызыкнуў на больш рашучыя дзеянні і 30 верасня зняў асаду.

## ПРАДАЎЖАЮЧЫ СПРАВУ СКАРЫНЫ

Звесткі з некаторых літаратурных крыніц пра тое, што друкарня ў Слуцку з'явілася ў 1581 г., пакуль не пацвердзіліся. Дакладна вядома — друкаваць кнігі ў горадзе пачалі ў другой палове XVII ст. Па дадзеным А. П. Грыцкевіча, у перыяд 1673—1687 гг. у Слуцку іх было выпушчана 23 агульным тыражом 24 200 экземпляраў [1]. Са Слуцкай друкарні выйшлі кнігі па вайсковых пытаннях, мастацкія творы, пераклады з французскай і нямецкай моў, мемуары, календары, нататкі падарожнікаў. У 1678 г. была выдадзена ў перакладзе з французскай кніга П. Рыко «Турэцкая манархія». У ёй было змешчана 16 гравюр, магчыма, беларускага майстра Максіма Вашчанкі. Самы вялікі тыраж тады быў у «Буквара» (3389 экземпляраў). Ніводная з кніжак, якія ўбачылі свет у XVII ст. у Слуцку, яшчэ не перавыдавалася. Некаторыя з іх, на жаль, сёння нам пакуль што вядомыя толькі па назвах.

## ДЗІМІТРЫЙ РАСТОЎСКІ

Пасля Брэсцкай уніі (1596) праваслаўная мітраполія ў Кіеве поўнасцю аднавілася толькі праз 24 гады. Зразумела, што ўвесь гэты час слуцкія праваслаўныя царкоўныя ўлады Кіеву не падпарадкоўваліся. І пасля аднаўлення мітраполіі тамтэйшым царкоўнікам не адразу ўдалося ўзяць духоўную ўладу над Слуцкам. Серна-Салаўевіч пісаў: «Пры архімандрыце Іларыёне Бала-

[1] Грицкевич А. П. Древний город на Случи. С. 114.

ANDRZEIA

MAXIMILIANA

# FREDRA,

KASZTELLANA LWOWSKIEGO.

Potrzebne Consideratie około Porządku Woiennego, y Pospolitego Ruszenia.

Przez

FRANCISZKA GLINKĘ z RAFAŁOW,

do Druku Podane.

A teraz z Przydatkiem

SPORZĄDZENIA OECONOMIEY

WOIENNEY.

Z

*Sposobu, iakoby Woyska Rzeczypospolitey mogły być w dobrym porządku zatrzymane.*

Powtornie przedrukowane;

W SLUCKU. Roku Pańskiego 1675.

Тытульны ліст кнігі А. М. Фрэдра «Неабходныя заўвагі пра ваенны парадак», выдадзенай у Слуцку ў 1675 г.

ценскім (1641—1649) Кіеўскі мітрапаліт звяртаўся з просьбаю да Слуцкага праваслаўнага брацтва аб выдачы яму субсідыі на паездку да польскага караля з петыцыяй аб абароне праваслаўя ў Кіеўскай мітраполіі»[1].

У другой палове XVII ст. Слуцк паступова ператвараецца ў праваслаўную сталіцу Беларусі. Гісторык І. А. Шляпнікаў пісаў: «У Слуцкім манастыры ў 1659 г. ... пражываў мітрапаліт Дзіанісій Балабан і нават заснаваў кансісторыю, як у Кіеве, якую падтрымліваў уладар Слуцка князь Багуслаў Радзівіл»[2]. Кансісторыя — калегіяльны епархіяльны орган з царкоўна-адміністрацыйнымі і царкоўна-судовымі функцыямі. Заснаванне яе азначала, што горад у той час зрабіўся, як мінімум, цэнтрам епархіі.

Праз 19 гадоў архімандрыту Слуцкага Трайчанскага манастыра Феадосію Васілевічу быў нададзены сан беларускага епіскапа. Васілевіч вёў наступальную царкоўную палітыку — будаваў новыя цэрквы, адбіраў старыя, якія былі захоплены уніятамі. «Ён адабраў уніяцкую царкву ў 1666 г. і ад базільян Спаскі молеўскі манастыр у 1674 г.», — пісаў І. А. Шляпнікаў. Тут мабыць, дапушчана друкарская памылка. Не «молеўскі», а Магілёўскі манастыр адабраў тады ад базільян Васілевіч (у слове Магілёўскі прапушчаны склад «гі»).

«Відаць, — пісаў Шляпнікаў, — што Васілевіч недалюбліваў маскоўскі ўрад і заўсёды схіляўся да Польшчы, хоць і быў шчырым праваслаўным пастырам»[3]. Шляпнікаў тут памыляецца. Васілевіч сапраўды недалюбліваў маскоўскі ўрад, але яму не было ніякай неабходнасці схіляцца да Польшчы, бо жыў і працаваў ён у аўтаномным княстве ў той час, калі ўладарка княства

---

[1] Серно-Соловьевич Ф. Ф. Древне-русский город Слуцк и его святыни. С. 14.

[2] Шляпников И. А. Св. Дмитрий Ростовский и его время (1651—1709). СПб., 1891. С. 21.

[3] Тамсама. С. 22.

жыла ў Германіі і адтуль кіравала Случчынаю. Факты сведчаць, што Феадосій Васілевіч не хацеў падпарадкоўвацца кіеўскай мітраполіі.

У 1676 г. кіева-пячэрскія манахі абвінавацілі Васілевіча ў растраце грошай іх маёнткаў у Беларусі і Літве. Відаць, тут справа была не ў грашах, а ў непакорлівасці Феадосія. Да таго ж Кіеў пасля руска-польскай вайны 1654—1667 гг. паводле Андрусаўскага перамір'я 1667 г. і «Вечнага міру» 1686 г. перайшоў да Расіі. Незалежная палітыка Васілевіча пацвярджаецца яго пастулатам, што Русь (Беларусь) прыняла крыж ад Канстанцінопальскага патрыярха і перад ім будзе мець справаздачу. Карацей кажучы, епіскап Васілевіч вёў барацьбу за аўтакефалію беларускай царквы.

У Слуцкага брацтва і епіскапа Васілевіча ў той час наладзіліся добрыя адносіны з царкоўнікамі Чарнігава, якія называлі Феадосія «дзіўнай свечкай усходняй царквы», «намеснікам кіеўскага мітрапаліта».

13 жніўня 1677 г. з Чарнігава ў Слуцк прыехаў іераманах Дзімітрый (Даніла Туптала) — пісьменнік, будучы мітрапаліт растоўскі. Пазнаёміўшыся з горадам, Дзімітрый выехаў у Вільню з старшым Віленскага брацтва Кліменціем Трызнаю, які пазней стаў епіскапам магілёўскім. Верасень і палову кастрычніка 1677 г. Туптала правёў у Вільні, выступаў з пропаведзямі. 14 кастрычніка туды ж прыехаў Васілевіч, і яны разам адбылі ў Слуцк. 6 снежня 1677 г. Дзімітрый пасяліўся ў келіі Праабражэнскага брацкага манастыра.

Праабражэнскі, Старчыцкі, Грозаўскі і іншыя манастыры падпарадкоўваліся Трайчанскаму, дзе знаходзілася рэзідэнцыя епіскапа Васілевіча. Кіраўніком Праабражэнскага брацтва ў той час быў Іаан Скачкевіч, які стаў і асноўным мецэнатам Дзімітрыя.

У Слуцку Дзімітрый вывучаў польскую і лацінскую мовы, выступаў з пропаведзямі ў Старчавіцкім і Грозаўскім манастырах. Ён падтрымліваў Васілевіча ў яго

імкненнях зрабіць беларускую царкву аўтакефальнай. Аб гэтым сведчыць цікавы твор Дзімітрыя. На пагосце Трайчанскага манастыра ён уласнаручна выкапаў калодзеж, сам зрабіў зруб і на верхняй дошцы выразаў двухрадкоўе:

> Почто намъ въ Самарію за водой ходити,
> Егда и зде, въ Случеске, лепо ее пити? [1]

Верш з сакрэтам. У ім адлюстраваны імкненні слуцкіх царкоўнікаў і іх кіраўніка Васілевіча да незалежнасці. Самарыя — гэта горад у Палесціне, куды вернуючыя хадзілі па святую ваду. У пераносным сэнсе гэта — і Кіеў з сваёй мітраполіяй, і іншыя сталіцы, якім не хацелі падпарадкоўвацца Васілевіч, яго прыбліжаныя і слуцкія братчыкі са Скачкевічам. Верш Дзімітрыя меў і другі сэнс: вада ў Слуцку такая ж святая, як і ў Самарыі, і ва ўсіх іншых месцах.

Калі калодзеж ад часу разбурыўся, яго засыпалі. Нехта са слуцкіх мастакоў намаляваў тады ікону «Гутарка Хрыста з самарыцянкаю», на якой аднавіў верш Дзімітрыя. Ікона была напісана на два аршыны... Дзе падзеўся гэты мастацкі твор пасля закрыцця ў пачатку 30-ых гадоў нашага стагоддзя Трайчанскага манастыра, мне ўстанавіць не ўдалося.

11 сакавіка 1678 г. беларускі епіскап Феадосій Васілевіч памёр у сваім маёнтку Новы Двор. Захаваўся панегірычны верш на польскай мове, у якім услаўляецца «архімандрыт Слуцкі, намеснік мітрапаліта Кіеўскага ў Вялікім княстве Літоўскім» Феадосій Васілевіч за тое, што ён «абараняў царкву, стаяў за яе вольнасць» [2].

29 лістапада 1678 г. памёр Іван Скачкевіч. На яго пахаванні Дзімітрый выступіў з прамоваю, а 29 студзе-

---

[1] Серно-Соловьевич Ф. Ф. Древне-русский город Слуцк и его святыни. С. 5.

[2] Шляпников И. А. Св. Дмитрий Ростовский и его время. С. 22.

ня 1679 г. выехаў са Слуцка ў Чарнігаў. У 1689 г. ён наведаў Маскву. У 1702 г. Пётр І прызначыў яго мітрапалітам у Растоў Вялікі. Там Дзімітрый займаўся літаратурнай дзейнасцю, заснаваў школу, у якой вялося выкладанне лацінскай і грэчаскай моў.

Гэты буйны рэлігійны дзеяч і асветнік пакінуў пасля сябе вялікую колькасць маральна-павучальных, багаслоўскіх, палітычных твораў. Ён склаў шматтомны збор «Чэцці-Мінеі» (апісанне жыцій святых), напісаў «Розшук аб раскольніцкай брынскай веры», накіраваны супраць расколу, некалькі драм. У сярэдзіне XVIII ст. Дзімітрый Растоўскі быў кананізаваны (прылічаны да ліку святых).

21 верасня 1761 г. на беразе ракі Дон закладзена новая цытадэль, якой указам імператара было дадзена імя — цытадэль Святого Дзімітрыя Растоўскага. Цяпер гэта горад Растоў-на-Доне.

Крыху больш за год прабыў на Беларусі госць з Украіны. Але памяць аб сабе пакінуў на стагоддзі. Дзейнасць Дзімітрыя Растоўскага на Беларусі — яркая старонка даўніх непарыўных сувязей паміж беларускім і ўкраінскім народамі.

## *МЕМУАРЫ ЯНА ЦАДРОЎСКАГА*

Да ліку першых пісьменнікаў-мемуарыстаў Случчыны належыць Ян Янавіч Цадроўскі. Вядома, што нарадзіўся ён 3 сакавіка 1617 г. у паселішчы Пагост, што ў цяперашнім Салігорскім раёне. А. Ф. Коршунаў у каментарыях да яго мемуараў адзначае, што ў Салігорскім раёне ёсць два Пагосты. На самой справе іх нават тры. У якім жа з іх нарадзіўся пісьменнік? Думаецца, што месцам яго нараджэння з'яўляецца фальварак Пагост, а не былое мястэчка ці вёска з такою назваю. Сам мемуарыст адзначае, што яго радзіма «мілі тры за Слуц-

кам». Міля — гэта амаль 8 кіламетраў. Да былога фальварка Пагост (яшчэ яго называлі Пагост Слуцкі) ад Слуцка цяпер лічыцца 20 кіламетраў. Гэта і ёсць «мілі тры».

Фальварак Пагост размяшчаўся на правым беразе Случы. На тым месцы да нашых дзён захаваліся рэшткі паркавых і садовых насаджэнняў. Яшчэ ў пасляваенны час там працаваў бровар. Магчыма, бацька пісьменніка быў аканомам фальварка, які належаў князю Янушу Радзівілу. У 1626 г. яго выбралі паслом на Варшаўскі сейм ад Мінскага ваяводства.

Мемуарыст не апісвае сваё дзяцінства. Ён адзначае толькі, што ў 1631 г. яго разам з братам-блізнюком Стэфанам бацька накіраваў у Кра́левец (цяпер Калінінград) вывучаць нямецкую мову і іншыя навукі, а ў 1635 г. перавёў абодвух у Кракаўскую акадэмію, потым уладкаваў Яна на прыдворную службу да Багуслава Радзівіла.

У 1638—1639 гг. Цадроўскі суправаджаў Радзівіла ў яго паездцы ў Еўропу. Чаго ехаў князь за мяжу? Відаць, атрымаць там універсітэцкую адукацыю. Было яму тады толькі семнаццаць гадоў, а суправаджаючаму Яну Цадроўскаму — дваццаць. Прыдворнае жыццё навучыла мемуарыста асцярожнасці і дыпламатычнасці. Ён нідзе ні слова не сказаў пра тое, чым канкрэтна займаўся Багуслаў за мяжою.

«Затрымаўся ягамосць князь у Фрызіі, — пісаў Цадроўскі, — іменна ў Гронінгу і ў Франекеры, а потым ва Утрэхцкай акадэміі» [1].

З Галандыі Радзівіл са сваёй світаю пераехаў у Парыж. Тут ён затрымаўся на сем месяцаў. Мусіць, зноўтакі слухаў лекцыі ў мясцовым універсітэце. Потым падарожнічаў па Францыі, наведаў французскага караля,

---

[1] Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. Мн., 1983. С. 124.

быў у Англіі і сустрэўся там з каралём Карлам, «якога потым, — заўважае мемуарыст, — яго ж падданыя судзілі і галаву яму адсеклі». Пасля падарожжа па Францыі і Англіі вярнуўся ў Галандыю, у Утрэхт. Ва ўсіх гэтых паездках князя суправаджаў Ян Цадроўскі, які, відаць, карыстаўся ў яго асаблівым даверам. Красамоўны такі факт: у Лондан на прыём да Карла Радзівіл ездзіў з порта Дуўр без світы, браў з сабою толькі Яна Цадроўскага.

Падарожжа, відавочна, спустошыла кішэні Багуслава, бо, як адзначае мемуарыст, «ягамосць князь адправіў з Галандыі ў Літву частку моладзі». Для нагляду за маладымі людзьмі Радзівіл накіраваў на радзіму і Цадроўскага. Князь, відаць, клапаціўся не столькі пра догляд за маладымі людзьмі, колькі пра тое, каб яго давераная асоба прывезла яму грошай.

У 1640 г. Ян вярнуўся ў Галандыю. Па дарозе туды і назад з ім адбываліся розныя прыгоды. Калі ехаў на радзіму, у Круляўцы яго моцна паранілі ў галаву пры сутычцы «падпітай моладзі ягамосці князя» з «пісарам з замка». А пры звароце назад на моры разгуляўся шторм. Карабель, на якім плыў Цадроўскі, разбіўся і затануў, але сам ён не пацярпеў.

У 1642 г. князь зноў адправіў Цадроўскага на радзіму, а ў 1643 г. за верную службу даў яму пасаду ў Старой Вёсцы пад Варшаваю, дзе будучы мемуарыст жыў і працаваў недзе 7—8 гадоў. Тут ён першы раз ажаніўся, але праз год яго жонка памерла. У 1650 г. ажаніўся другі раз. Вяселле згуляў у Капылі. Пасля жыў на Міншчыне. Мемуарыст адзначае, калі ў яго якое дзіця нарадзілася, хто яго хрысціў, якое з іх калі памерла. Карацей кажучы, запісы ўсе бытавыя, свецкія, а не рэлігійныя.

У 1655 г. у час наступу «маскоўскага войска» Цадроўскі, як цяпер кажуць, знаходзіўся ў эвакуацыі ў Літве. У 1656 г. ён вярнуўся на Міншчыну.

Аўтар апісвае жахі, якія перажывала Міншчына ў час голаду ў 1656—1657 гг.: «...Настаў вялікі голад, які працягваўся аж да жніва 1657 года, так што галодныя людзі катоў, сабак і ўсякую здыхляціну елі, а пад канец людзей рэзалі і целы іх елі, нават вылежацца ў дамавінах людскім трупам не давалі, чаго я, няшчасны чалавек, сваімі вачыма нагледзеўся»[1]. Далей ён расказвае, як па даручэнні мінскага ваяводства вазіў чалабітную цару Маскоўскаму.

Праз некаторы час пасля ўдзелу ў баявых дзеяннях, у выніку якіх загінула «болей за трыццаць чалавек адборнай маскоўскай пяхоты», Ян Цадроўскі, пакінуўшы свой дом, выехаў у Слуцк да бацькоў жонкі.

У 1660 г. памерла другая жонка мемуарыста. Праз сем гадоў ён у Вільні ўступіў у шлюб з Соф'яй Рымвід. У 1670 г. сканала маці. Пазней надараліся і прыемнасці: у лютым 1672 г. дачка Тэафілія выйшла замуж, а 13 снежня 1672 г. нарадзіўся ўнук Ян. На гэтым канчаецца першая частка ўспамінаў. Другая частка пісалася, бадай, праз дзесяць гадоў пасля першай. Яна пачынаецца з пераліку таго, у якія органы выбіраўся аўтар: «Два разы быў я дэпутатам ад Мінскага ваяводства ў галоўным трыбунальскім судзе Вялікага княства Літоўскага... Дзевяць разоў з'яўляўся паслом ад свайго ваяводства на сеймах».

Апошні запіс адносіцца да 1682 г., калі ў выніку падбухторвання езуітаў «студэнты з гарадской чэрню» раптоўна напалі і разбурылі збор і дамы, у якіх жылі пратэстанты. «Кнігі папалілі... Немаўля нявіннае, якое ў пялёнках яшчэ было, яны ў агонь кінулі... Трупы памершых з трунаў выцягвалі, без сораму здзекаваліся над імі, палілі... А з імі быў езуіт нейкі інкогніта, з тварам закрытым, каб не пазналі яго» — такім трагічным і жахлівым малюнкам заканчваюцца мемуары.

[1] Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. С. 128.

У поўным выглядзе ўспаміны Цадроўскага надрукаваны ў кнізе «Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст.», якая выйшла ў 1983 г. у выдавецтве «Навука і тэхніка». Яны з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння жыцця нашага народа ў XVII ст.

Цадроўскія на Случчыне жылі і ў XVIII ст. У спісах вучняў Слуцкай гімназіі значацца: Стэфан Цадроўскі (1736), Самуіл Цадроўскі (1748), Іван Цадроўскі (1751), Станіслаў Цадроўскі (1764).

## *ЯН АНДРЭЙ БЕЛАБОЦКІ (БЕЛАБЛОЦКІ)*

Андрэй Хрыстафоравіч Белабоцкі — філосаф і паэт. Скончыў Слуцкую кальвініцкую гімназію, вучыўся ва універсітэтах Заходняй Еўропы. Пасля некаторы час працаваў у Слуцку кальвінісцкім прапаведнікам, а потым настаўнікам у Магілёве. З-за праследаванняў езуітаў каля 1680 г. пераехаў у Маскву, дзе прыняў праваслаўе, займаўся перакладчыцкай і літаратурна-педагагічнай дзейнасцю. Напісаў «Вялікую навуку Раймунда Люлія», «Кнігу філасофскую», «Рыторыку», «Кароткую гутарку міласці з ісцінай» і іншыя кнігі, дзе праводзіў думку, што вера — гэта асабістая справа чалавека, выказваўся супраць афіцыйнай царквы і крытыкаваў Біблію.

Ва ўсіх вядомых мне выданнях прозвішча філосафа і паэта пішацца Белабоцкі. Аналіз спісаў вучняў, якія займаліся ў Слуцкай гімназіі ў XVII—XIX стст., наводзіць на думку, што сапраўднае яго прозвішча хутчэй за ўсё Белаблоцкі. У гэтыя стагоддзі пад Брэстам было шляхецкае гняздо Белаблоцкіх. Менавіта з яго і паходзяць усе Белаблоцкія, якія вучыліся ў Слуцкай гімназіі. Справы аб шляхецтве гэтага рода ў 1976 г. я вывучаў у Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве СССР у Ленінградзе. Паводле дакументаў, шляхціцаў

Белабоцкіх на тэрыторыі Беларусі і ў Расіі ў XIX ст. не было.

Галоўны твор Белабоцкага (Белаблоцкага?) — паэма «Пентатэугум, або Пяць кніг кароткіх».

О светлейше злата солнце, луно, чиста паче сребра,
Смерть блискую слышит сердце, мне умрети, вам жизни добра.
Два светила в день и ночи, вас век старости не знает.
Нам сон смерти лезет в очи, старых и младых стращает

— такі філасофскі зачын паэмы [1].

«Кто написал, кто слушает и кто чтет, смерти к себе ждет», «ні прозьбою, ни грозьбою смерць не сунімеш», — сцвярджае паэт. Белабоцкі выступае ў творы як цвярозы рэаліст, які не верыць у рай і пекла на тым свеце.

Андрэй Белабоцкі ажаніўся з дачкою дробнага маскоўскага чыноўніка з духавенства. Валодаючы лацінскай, французскай, іспанскай і італьянскай мовамі, прэтэндаваў на пасаду рэктара Славяна-грэка-лацінскай акадэміі, але з гэтага нічога не выйшла. У 1686 г. філосаф быў прылічаны да пасольства Ф. Галавіна ў Кітай для перакладу лацінскіх тэкстаў. Праз 6 гадоў ён вярнуўся, і больш звестак аб ім няма.

На мове твораў Андрэя Белабоцкага адчуваецца моцны ўплыў беларускіх гаворак. Рускі даследчык А. Панчанка папракае Белабоцкага за тое, што яго «Пентатэугум» напісаны на дрэннай рускай мове і адразу выдае замежнага чалавека [2], называе паэта палякам. Па сутнасці ж паэма напісана на змешанай беларуска-рускай мове таго часу, зрэдку ў ёй трапляюцца і паланізмы. Асобныя звароты, якія ўжывае Белабоцкі, і сёння жывыя ў нашай мове. «Дрэнная мова» «Пентатэугума» дае падставу лічыць гэты твор як беларускім, так і рускім.

Сучасны беларускі літаратуразнаўца Адам Мальдзіс,

---

[1] Русская силлабическая поэзия XVII—XVIII вв. Л., 1970. С. 218.
[2] Тамсама. С. 34.

параўноўваючы жыццё і творчасць Сімяона Полацкага і Яна Андрэя Белабоцкага, знаходзіць у іх шмат агульнага. «Як Сімяон Полацкі, так і Андрэй Белабоцкі, — адзначае вучоны, — аднačасова належаць некалькім славянскім літаратурам, з'яўляюцца сведчаннем іх даўняй еднасці... Сімяон і Белабоцкі пашырылі сярод усходняга славянства духоўную паэзію, панегірыкі, геральдычныя і эмблематычныя вершы, характэрныя для польскага і заходнееўрапейскага барока»[1].

Усё гэта так, але, на жаль, творчасць Яна Андрэя Белабоцкага (ці Белаблоцкага) да гэтага часу ўсё яшчэ фактычна ігнаруецца ў рэспубліцы. Ніводны яго твор у нас не выдаваўся.

## ІЛЬЯ КАПІЕВІЧ

У другой палове XVII ст. скончыў Слуцкую кальвінісцкую гімназію Ілья Піліпавіч (Фёдаравіч) Капіевіч (1651(?)—1714). Дзе ён нарадзіўся, дакладна пакуль што невядома. Некаторыя даследчыкі лічаць, што каля Брэста, іншыя сцвярджаюць, што на Мсціслаўшчыне. Магчыма, бацькам яго быў Пілін Капіевіч, які ў 1660—1662 гг. займаў пасаду рэктара Слуцкай гімназіі.

Скончыўшы школу, Ілья паступіў у адзін з заходнееўрапейскіх універсітэтаў. Пасля заканчэння вярнуўся ў 1674 г. у Слуцк і пачаў працаваць у гімназіі. У кнізе І. Глебава «Историческая записка о Слуцкой гимназии...» у спісах выкладчыкаў Ілья Капіевіч значыцца лектарам.

Зведаўшы ганенні езуітаў, Капіевіч выехаў у Галандыю, жыў у Амстэрдаме. Мусіць, не выпадкова апынуўся ў гэтым горадзе. Ці не тут ён у свой час скончыў уні-

---

[1] Мальдзіс А. І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн. 1980. С. 53—54.

версітэт? З 1698 г. Капіевіч працаваў у друкарні Я. Тэсінга, якому Пётр I даў прывілеі на друкаванне кніжак на рускай мове. У 1700 г. заснаваў сваю друкарню.

З гэтага моманту і да канца жыцця дзейнасць Капіевіча звязана з Расіяй. Ён напісаў, падрыхтаваў і пераклаў на рускую мову больш за дваццаць кніжак па гісторыі, геаграфіі, граматыцы і іншых навуках. У апошнія гады быў перакладчыкам у Пасольскім прыказе ў Маскве. Сваю жыццёвую мэту Ілья Капіевіч бачыў у распаўсюджванні ведаў сярод славянскага люду. Напісаў «Рыторыку», «Паэтыку», пераклаў на рускую мову байкі Эзопа, выдаў зорную карту. Яго асветніцкая дзейнасць адыграла значную ролю ў развіцці адукацыі ў Расіі.

У пісьме да Пятра I Ілья Капіевіч пісаў: «Больш за 20 кніг напісаў я на славу тваёй прасвятлейшай царскай вялікасці і на сусветную карысць Расійскай дзяржавы»[1].

## НАПЯРЭДАДНІ АСВЕТНІЦТВА

Пасля вядомага ўздыму ў часы Рэнесанса і Рэфармацыі ў пачатку XVII ст. беларуская культура трапіла ў неспрыяльныя ўмовы, выкліканыя контррэфармацыяй і бясконцымі войнамі Рэчы Паспалітай, у склад якой тады ўваходзіла Беларусь. Полымя вызваленчай барацьбы ўкраінскага і беларускага народаў у 1648—1653 гг. і вайны Рэчы Паспалітай з Рускай дзяржавай у 1654—1667 гг. прашугала і па Случчыне.

У 1695 г. памерла Слуцкая княгіня Караліна Радзівіл, якая была замужам у Германіі і хоць рэдка, але наведвала свае княства. Нейбургскія ж прынцэсы каля

[1] Антология педагогической мысли Белорусской ССР. М., 1986. С. 136.

паўстагоддзя кіравалі спадчынным уладаннем праз даверaных асоб.

У канцы XVII ст. у Слуцку адбываліся выступленні мяшчан супраць прыгнёту з боку мясцовых крэзаў, але яны былі задушаны. У 1705—1706 гг. ішла Паўночная вайна. Тут па загаду Пятра I стаялі ўкраінскія казакі. Потым улада пераходзіла з рук у рукі: горад захапілі шведы, у 1707 г. уступілі рускія войскі, у 1708 г. — зноў шведы. Вялікіх страт Слуцку і Случчыне ў той час шведскія войскі не прычынілі, бо Карл XII даводзіўся сваяком нейбургскім прынцэсам. У 1711 г. на некалькі дзён спыняўся ў горадзе Пётр I.

У першай палове XVIII ст. на Случчыне з'яўляюцца мануфактуры па вытворчасці сукна для княжацкага войска і шоўкавых паясоў. Да 1705 г. ў горадзе дзейнічала друкарня. Працавалі таксама паперня, васкабойня, фарбавальня і іншыя майстэрні, у якіх было занята каля 900 рамеснікаў, з іх больш за 100 — шаўцы.

Яшчэ ў 80-ыя гады XVII ст. у Слуцкай кальвінісцкай гімназіі пачалі ставіць камедыі. У езуіцкім калегіуме — яго будынак стаяў побач з гімназіяй — у 1715—1736 гг. таксама дзейнічаў школьны тэатр. Захавалася праграма пастаноўкі драмы «Ваенная доблесць, якая з'явілася ад навукі», у якой расказваецца пра юнака, што, дзякуючы сваёй вучонасці і смеласці, выратаваў ад ворага родны горад.

Калегіум меў бібліятэку, падрыхтаваныя выкладчыцкія кадры. Ён сапернічаў з гімназіяй.

Ёсць звесткі, што ў першай палове XVIII ст. выпускнік Слуцкай гімназіі Іван Бітнер у адным з універсітэтаў Заходняй Еўропы абараніў дысертацыю. Яго праца была выдадзена асобнай кніжкай. У 1691—1692 гг. рэктарам Слуцкай гімназіі працаваў Хрыстафор Бітнер. Іван Бітнер, відаць, быў яго сынам.

У пачатку XVIII ст. у Слуцкім калегіуме выкладаў філасофію, граматыку і тэалогію Ян Пашкоўскі (1684—

1757), вядомы педагог, які быў потым рэктарам Нясвіжскага езуіцкага калегіума. Ён выдаў у Вільні папулярныя ў свой час «Палітычныя каляндарыкі», дзе апублікаваў шмат звестак па гісторыі і культуры Беларусі і Літвы.

У 1723 г. у Слуцку напісаў кніжку «Ключ да сардэчных скарбаў» тэолаг А. Кярсніцкі (1678—1733), які, відавочна, працаваў у Слуцкім езуіцкім калегіуме. У сваёй кнізе Кярсніцкі развіваў думку аб боскім умяшанні ў людскія справы. «Творы Пашкоўскага і Кярсніцкага, — адзначае Адам Мальдзіс, — тыповы ўзор контррэфармацыйнай літаратуры»[1].

У 1586 г., як ужо адзначалася, было ўтворана Праабражэнскае брацтва. У апошняй чвэрці XVII ст. узнікла Успенскае брацтва. Узначальвалі і адно, і другое багатыя кіраўнікі гарадскога магістрата. Пры брацтвах працавалі школы. У сярэдзіне XVIII ст. у Слуцку налічвалася 15 праваслаўных храмаў і тры манастыры. Як і раней, важную ролю ў жыцці горада і краю адыгрываў Трайчанскі манастыр, у якім размяшчалася рэзідэнцыя беларускага епіскапа. Пры манастыры працаваў калегіум для падрыхтоўкі духоўных асоб, ператвораны ў канцы XVIII ст. у духоўную семінарыю.

З 1744 г. таспадаром Слуцкага княства становіцца Геранім Фларыян Радзівіл. У гэты час з Бялай Падляскі пераводзіцца ў Слуцк вайсковая школа, якая рыхтавала афіцэраў для княжацкага войска. З Берліна, Вены і іншых гарадоў запрашаюцца тэатральныя трупы. Пры Гераніме Радзівіле ў горадзе з'яўляюцца тэатр, балетная школа.

Перад тым як сесці на княжацкі трон, Геранім Радзівіл правёў 5 гадоў за мяжою, пераважна ў Прусіі. Ён усталяваў нямецкія парадкі і пры сваім двары ў Слуцку, нават заснаваў тут кірху, дзе слухаў казанні на нямецкай мове. У часы Гераніма на Замкавай горцы

[1] Мальдзіс А. І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. С. 30.

(цяпер там гарадскі Дом культуры) яшчэ стаяла высокая вежа ад Верхняга замка, перatворaная ў турму. Князь любіў цешыцца пакутамі «салаўёў» (так ён называў вязняў). Жорсткасць ката з тытулам князя не ведала межаў. Аднойчы ён пабачыў праз акно прыдворнага, які прахаджваўся каля брамы, паклікаў яго да сябе і спытаў: «Чаго ты тут круцішся?»

— Хачу быць заўсёды на відавоку ў князя, таму і стаю тут.

Радзівіл загадаў павесіць прыдворнага на браме. Пры гэтым ён сказаў: «Цяпер ты заўсёды будзеш у мяне на віду».

Мемуарысты адзначаюць слабасць розуму, гняўлівасць і помслівасць магната. Ён і ўсміхаўся толькі тады, калі абдумваў помсту або кару. Геранім тры разы быў жанаты. Дзве жонкі ўцяклі ад яго, а трэцюю ён трымаў пад замком.

У народнай памяці гэты ўладар застаўся жорсткім катам, што бязлітасна задушыў Крычаўскае паўстанне. У канцы XIX ст. скрынка з сэрцам Гераніма, якое было надгрызена мышамі, яшчэ захоўвалася ў слуцкім фарным касцёле. Ён размяшчаўся на тэрыторыі бернардынскага манастыра (цяпер там слуцкая маслабаза). У скляпеннях пад манастыром, як ужо адзначалася, хавалі і асоб з княжацкага роду. Адна з магіл захоўвалася да 1987 г.

Кажуць, што ніхто так красамоўна не хлусіць, як відавочцы. Таму да мемуараў, у тым ліку і да ўспамінаў пра Гераніма Радзівіла, трэба ставіцца крытычна. Меркаванне аб яго слабым розуме не пацвярджаецца фактамі. З тымі, хто яму быў патрэбны, Геранім паводзіў сябе тактоўна, ветліва прымаў іх у сваім замку.

Геранім Радзівіл памёр у 1760 г. У Вільні і Нясвіжы выйшлі тады з друку «Плачы» напісаныя вершамі і прозаю, у якіх жорсткі прыгоннік называўся добрым грамадзянінам і адважным воінам.

Мемуарысты знаходзілі ў характары Гераніма Радзівіла толькі дзве станоўчыя рысы: цвярозасць і акуратнасць. Да іх можна прыбавіць і балетаманію, бо дзякуючы ёй у Слуцку з'явіўся першы ў Беларусі балет і балетная школа.

## *ЭМАНУІЛ (МІХАІЛ) КАЗАЧЫНСКІ Ў СЛУЦКУ*

У 1976 г. у газеце «Літаратура і мастацтва» быў апублікаваны мой артыкул «Некалькі «чаму?», у якім між іншым гаварылася: «На тэрыторыі слуцкага Трайчанскага манастыра былі пахаваны многія дзеячы беларускай культуры старажытных часоў. Значэнне гэтага помніка выходзіць за межы Беларусі. Тут быў пахаваны ўраджэнец Беларусі епіскап Казачынскі, які шмат зрабіў для асветы народаў Югаславіі...»

Сёння я магу адзначыць недакладнасць у тым артыкуле. Казачынскі быў родам не з Беларусі, а з Украіны. У Слуцку ён знаходзіўся ў якасці не епіскапа, а архімандрыта Трайчанскага манастыра, намесніка кіеўскага мітрапаліта ў Рэчы Паспалітай.

У пачатку 1970-ых гг. з Югаславіі прыйшло пісьмо ў Слуцкі краязнаўчы музей. Народная бібліятэка Бялграда прасіла тады прыслаць ім фотаздымкі Трайчанскага манастыра і помніка на магіле Казачынскага. На жаль, манастыр не захаваўся, не зберагліся і манастырскія могілкі. Але фотаздымкі апублікаваны ў кнізе Ф. Ф. Серна-Салаўевіча «Древне-русский город Слуцк и его святыни» і на дарэвалюцыйных паштоўках. Пра гэта тады краязнаўчы музей паведаміў у Бялград.

У 1980 г. выйшла ў свет кніжка А. І. Мальдзіса «На скрыжаванні славянскіх традыцый», у якой ён зрабіў спасылку на артыкул у ЛІМе. Больш у сучаснай бела-

рускай літаратуры імя Казачынскага нідзе пакуль што не ўпаміналася.

Як і чаму трапіў у наш горад адзін з пачынальнікаў сербскай драматургіі, украінскі філосаф XVIII ст. Эмануіл (Міхаіл) Казачынскі?

Мы ўжо гаварылі аб тым, што Слуцк у XVII ст. не хацеў прызнаваць духоўную ўладу кіеўскай мітраполіі. Тут ужо прывыклі абыходзіцца без яе. У 1649 г. слуцкі князь Багуслаў Радзівіл зацвердзіў у сан архімандрыта Праабражэнскага манастыра Варфаламея Скачкевіча і абавязаў яго падпарадкоўвацца Канстанцінопальскаму патрыярху. З 1678 г. архімандрыт Трайчанскага манастыра Феадосій Васілевіч стаў адначасова і епіскапам Белай Русі[1]. Да канца свайго жыцця ён фактычна не прызнаваў над сабою ўладу кіеўскай мітраполіі. З 1700 г. беларускім епіскапам быў прызначаны Серапіён Валхоўскі, які таксама праводзіў незалежную палітыку.

Аб тым, што беларускія епіскапы не хацелі быць у падначаленні ў Кіева, сведчыць і такі факт, апісаны ў кнізе Серна-Салаўевіча. У 1709 г. кіеўскі мітрапаліт Кракоўскі загадаў слуцкаму духавенству быць у падпарадкаванні ў яго, а не ў беларускага епіскапа. Але гэты загад, відаць, у Слуцку не прынялі ўсур'ёз, бо ў 1718 г. кароль Аўгуст II вымушаны быў пацвердзіць загад кіеўскага мітрапаліта. Кракоўскі, мяркуючы па ўсім, дабіваўся падтрымкі аж у караля. Ці выканалі ў 1718 г. ў Слуцку прадпісанне Аўгуста II?

Беларускія епіскапы жылі ў Слуцку, які хаця і ўваходзіў у Рэч Паспалітую, але гаспадары яго жылі ў Германіі. Слуцкае княства карысталася пэўнай аўтаноміяй. Фармальна беларускі епіскап не мог не прызнаць загад караля, а на практыцы гэта рашэнне лёгка было ігнараваць. У рэшце рэшт, каб зламаць непакорных, кіеў-

---

[1] Серно-Соловьевич Ф. Ф. Древне-русский город Слуцк и его святыни. С. 14.

ская мітраполія накіравала ў Слуцк свайго чалавека — Эмануіла (Міхаіла) Казачынскага. Толькі пасля таго, як Казачынскі стаў архімандрытам слуцкага Трайчанскага манастыра, сан беларускага епіскапа часова знік. З гэтага моманту кіеўская мітраполія зноў узяла пад сваю ўладу беларускую праваслаўную царкву.

Казачынскі быў прызначаны архімандрытам слуцкага Трайчанскага манастыра яшчэ 6 верасня 1746 г., але толькі праз два гады ён змог заняць пасаду. Гэта лішні раз сведчыць аб тым, што случчане не адразу здаліся. 152 гады (1596—1748) фактычна была незалежнай ад кіеўскай мітраполіі праваслаўная царква ў Слуцку.

За спіной кіеўскай мітраполіі стаялі сінод і царскі ўрад. Падпарадкаваць сабе праваслаўных Слуцка азначала ўзяць уладу над усёй праваслаўнай Беларуссю і тым самым часткова падрыхтаваць глебу для падзелу Рэчы Паспалітай.

У 1745 г. у Кіеве іераманах Казачынскі выдаў на лацінскай, польскай і ўкраінскіх мовах кнігу «Філасофія Арыстоцеля паводле разумення Перыпатэтыкаў». Ён абнародаваў таксама панегірык імператрыцы Лізавеце Пятроўне і яе палюбоўніку Разумоўскаму. З пункту гледжання царскага ўрада, сінода і кіеўскага мітрапаліта, такі чалавек мог вярнуць у лона расійскіх царкоўных улад ваяўнічых слуцкіх незалежнікаў. Давер Казачынскі апраўдаў. Адзін гэты чалавек зрабіў тады ў Беларусі больш, чым магла зрабіць цэлая царская армія. Недаацэньваць сілу царкоўнай палітыкі мы не можам, калі хочам па-сапраўднаму разабрацца ў тагачасных падзеях.

Эмануіл (Міхаіл) Аляксандравіч Казачынскі нарадзіўся ў 1699 ці ў 1700 г. (па другіх дадзеных у 1703 г.) на Украіне ў мястэчку Ямпаль у шляхецкай праваслаўнай сям'і. Вучыўся спачатку дома, потым бацькі аддалі яго ў Маскоўскую славяна-грэка-лацінскую акадэмію. Пасля вучобы падарожнічаў па Заходняй Еўропе. Маг-

чыма, што ён вучыўся і ў нейкім заходнееўрапейскім універсітэце. У 1720—1733 гг. працаваў выкладчыкам філасофіі ў школах Кіева. З 1733 па 1738 г. жыў і працаваў у Сербіі. Заснаваў там школу, займаўся літаратурнай дзейнасцю — напісаў «Рыторыку», «Трагікамедыю» і іншыя творы. Вярнуўшыся з Сербіі на Украіну, пастрыгся ў манахі, жыў у Кіеве ў Выдубіцкім манастыры. У 1739—1745 гг. выкладаў філасофію ў Кіеўскай акадэміі, працягваў увесь гэты час займацца літаратурай.

У канцы верасня 1748 г. Казачынскі прыехаў у Слуцк. У студзені наступнага года з'ездзіў у Белую Падляску, дзе ў той час жыў Геранім Радзівіл, які яму выдаў друкаваны дазвол на права займаць пасаду архімандрыта ў Слуцку. З дазволам Гераніма Казачынскі паехаў у Кіеў. 10 жніўня 1749 г. у Сафійскай сабornай царкве галоўнага горада Украіны адбыўся спецыяльны малебен у гонар прызначэння Казачынскага на пасаду слуцкага архімандрыта і замежнага намесніка кіеўскага мітрапаліта.

У Слуцку Казачынскі паспяхова вёў барацьбу з езуітамі, якія імкнуліся захапіць уладанні праваслаўных манастыроў. У 1752 г. рэвізоры з Кіева адзначалі, што ён вырашае праблемы «хутка і эфектыўна».

Асцярожны і хітры царкоўны дзеяч не ішоў з адкрытым забралам супраць каталіцызму ў пераважна каталіцкай Рэчы Паспалітай. Казачынскі заваяваў давер да сябе і павагу з боку князя Гераніма, выкарыстаўшы той факт, што слуцкія Радзівілы некалі былі пратэстантамі. Геранім Радзівіл падтрымліваў Казачынскага, прымаў у сваім замку, бываў на яго богаслужэннях у манастыры.

Ад князя Казачынскі дабіўся граматы, згодна якой праваслаўным забаранялася прыслужваць у іншаверцаў-іудзеяў, бо праваслаўныя, маўляў, прывыкаюць да чужой веры і забываюць сваю... Далей — болей. У 1755 г.

Аўтограф Эмануіла Казачынскага

з дазволу Радзівіла і кіеўскага мітрапаліта Шчарбацкага Казачынскі арганізаваў перанос мошчаў дзіцяці Гаўрыіла з Заблудава ў Слуцк. Да гэтай грандыёзнай пастаноўкі пад адкрытым небам Казачынскі добра падрыхтаваўся. Ён напісаў вершаваны «Надгробак», у якім расказаў пра жыццё і смерць Гаўрыіла. Твор Казачынскага быў надрукаваны ў Львове асобнай брашурай. Яе на шляху з Заблудава ў Слуцк (а гэта больш за 300 км) раздавалі людзям. Сербскі даследчык літаратуры Власцімір Ерчыч так ацэньвае гэту пастаноўку Казачынскага: «Перанос рэліквій (мошчаў. — *Р. Р.*) з Заблудава ў Слуцк... быў своеасаблівай нацыянальнай і палітычнай прапагандай... перанос суправаджаўся раздачай брашур з вершам Казачынскага і спяваннем песень на... народнай мове і расказамі пра тое, што гэту мову не прызнаюць палякі» [1].

Як бачым, замест звычайнага рытуала па пераносу царкоўных рэліквій пад кіраўніцтвам Казачынскага была пастаўлена беларуская народная трагікамедыя, дзе сцэнай сталі 300 кіламетраў тэрыторыі Беларусі, а галоўным героем — шасцігадовы хлапчук Гаўдзел Гаўрыіл, якога быццам бы замучылі іншаверцы. Нават праваслаўныя царкоўнікі ў Кіеве, па словах В. Ерчыча, перанос мошчаў з Заблудава ў Слуцк «прыраўнялі да спектакля».

[1] Ерчич Властимир. Мануил (Михаил) Козачинский и ньегова траедокомедия. Нови Сад — Београд. 1980. С. 181.

Поўны тэкст «Надгробка» змешчаны ў кнізе Ф. Ф. Серна-Салаўевіча «Древне-русский город Слуцк и его святыни». Скрынка (ра́ка) з мошчамі Гаўрыіла цяпер захоўваецца ў Гродне.

Каб адзначыць заслугі князя Гераніма Радзівіла за яго падтрымку праваслаўных, царскі урад перадаў яму праз Казачынскага ордэн Андрэя Першазванага. Удастоіўся ўзнагароды і архімандрыт слуцкі — мітрапаліт сібірскі прыслаў яму ў падарунак посах са слановай косці.

У час жыцця і дзейнасці ў Слуцку (1748—1755) Казачынскі напісаў некалькі твораў, у тым ліку «Реснос...», у якім ён даў адказ на ананімную каталіцкую брашуру.

У 1755 г. ён памёр ад жаўтухі. Пахаваны быў у Слуцку на манастырскіх могілках.

Можна спадзявацца, што праз нейкі час з'явіцца ў нас асобная кніжка пра Казачынскага. А пакуль што літаратура пра яго маецца толькі на ўкраінскай, рускай і сербскай мовах. Беларуская частка творчасці Казачынскага чакае яшчэ свайго даследчыка.

## *ПАД АПЕКАЙ МЕЛЬПАМЕНЫ І ТЭРПСІХОРЫ*

У агульным рэчышчы культуры Случчыны нельга не надаць увагі і развіццю тут тэатральнага і балетнага мастацтва, якія, безумоўна, з'яўляюцца важнымі паказчыкамі духоўнага жыцця нашага краю ў апісваемую эпоху.

«Пачаткам тэатральных паказаў у Слуцку лічаць 1751 г.», — адзначаюць аўтары «Гісторыі беларускага тэатра», выпуск якой у 1987 г. завяршыла выдавецтва «Навука і тэхніка». Тут ёсць недакладнасць. Тэатральныя паказы ў Слуцку былі і ў XVII ст., і ў першай па-

лове XVIII ст. Аб пастаноўках у гэты час у кальвінісцкай гімназіі і езуіцкім калегіуме мы ўжо гаварылі. Правільней было б сказаць, што 1751 г. з'яўляецца пачаткам тэатральных паказаў у слуцкім радзівілаўскім тэатры. У гэты час прыстасоўвалі для пастановак то манеж, то збройную палату Слуцкага замка. У 1752 г. пад тэатр пераабсталявалі памяшканне былога «суднага дома» на тэрыторыі Верхняга замка. Тут спектаклі ішлі да 1756 г. У 1759 г. было закончана будаўніцтва і абсталяванне кулiснымі машынамі новага будынка тэатра. Абапал яго размяшчаліся флігелі, дзе жылі музыканты, спевакі, размяшчалася балетная школа. На жаль, пакуль што невядома, на якім месцы стаяў гэты будынак.

Дэкаратарамі ў тэатры ў той час працавалі мастакі Тыц і Тышкевіч.

Камедыі, драмы і оперныя пастаноўкі ставілі тады ў Слуцку пераважна на нямецкай мове. Драматург Меер пісаў спецыяльна для тэатра драмы, у якіх шмат было батальных сцэн. Ставілі оперы і па-італьянску. Выкарыстоўвалі, відаць, драматычныя творы таксама на польскай мове. Артыстаў для тэатра шукалі ў Кёнігсбергу, Вене, Гданьску, запрашалі з Італіі. Упамінаюцца ў літаратуры імёны Мараўскага, Ажэльскага. Наймалі, мусіць, толькі вядучых акцёраў, у асноўным жа ў спектаклях удзельнічалі мясцовыя самадзейныя артысты з ліку кадэтаў вайсковага вучылішча. У масавых сцэнах былі занятыя цэлыя падраздзяленні салдат з тутэйшага гарнізона. Часам у якасці артыстаў выкарыстоўвалі нават вязняў з княжацкага астрога. Вядомы такі выпадак. Аднойчы па сюжэту пастаноўкі трэба было паказаць пакаранне смерцю праз павешанне. З турмы прывялі двух вязняў і павесілі іх на сцэне.

Радзівілаўскі тэатр у Слуцку адлюстраваў жыццё

---

[1] Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. Т. 1. С. 191. Мн., 1983.

княжацкага двара, дзе за дзесяцігоддзі залежнасці Слуцкага княства ад нямецкіх прынцаў і прынцэс моднымі сталі не толькі нямецкая мова, але і нямецкія парадкі, уплыў якіх яшчэ больш узмацніў пры двары князь Геранім Радзівіл.

У гэты час у горадзе існавала цудоўная капэла музыкантаў і была створана першая ў Беларусі балетная школа.

З'яўленне першага танцмайстра ў Слуцку адносіцца да 1753 г., але ён, відаць, не задаволіў Гераніма, і той у 1756 г. прыняў да сябе на працу італьянскага балетмайстра Антоні Пуцыні і французскага балетмайстра і танцора, саліста парыжскай оперы, аднаго з пачынальнікаў мужчынскага класічнага танца Максімільяна Дзюпрэ. Па загаду князя ў балетную школу набіраліся дзеці случчан у 8—10-гадовым узросце.

На працягу другой паловы 50-ых гадоў XVIII ст. слуцкі балет выступаў часта не толькі ў сваім горадзе, але і ў Нясвіжы, Белай Падлясцы. Рэпертуар яго пакуль што невядомы. Як вызначаюць даследчыкі па назвах касцюмаў і іншых прыкметах, у ліку спектакляў былі «Балет з арлекінам», «Венгерскі балет», «Турэцкі балет».

Пасля смерці Гераніма тэатр у Слуцку быў закрыты, а касцюмы і рэквізіт перададзены ў Нясвіж. Балетная трупа аб'ядналася з нясвіжскай.

## *НА ЗАКАЦЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ*

У сярэдзіне XVIII ст. Слуцк як адміністрацыйны цэнтр буйнейшых феадалаў Беларусі паступова пачынае адыходзіць на другі план. Памёр князь Геранім, горад фактычна перастаў быць «паралельнай» сталіцай Радзівілаў. І хоць яшчэ 31 год (да 1791 г.) ён заставаўся цэнтрам княства, але ім фактычна кіравалі з Нясвіжа.

Тым не менш Слуцк у гэты перыяд і значна пазней усё яшчэ працягваў заставацца буйным культурным цэнтрам Беларусі.

...Гартаю спісы навучэнцаў Слуцкай кальвінскай гімназіі. Толькі ў XVIII ст. тут вучыліся пяць Цадроўскіх. Гэта ўсё сваякі таго Цадроўскага, пра мемуары якога мы гаварылі.

У спісах за 1749 г. сустракаю і Фаму (Тамаша) Гратко̆ўскага. У 1761 г. ён ужо рэктар Слуцкай гімназіі. Пра яго Адам Мальдзіс піша: «Граткоўскі Тамаш, паэт з беларускай кальвінскай сям'і. Вучыўся ў Кёнігсбергу і Лейдэне... Аўтар паэмы «Марское падарожжа», у якой апісаў свае прыгоды на шляху з Амстэрдама да Гданьска»[1]. Чаму гэта паэма адукаванага беларускага паэта, які пісаў на польскай мове, да гэтага часу не перакладзена на родную мову? На жаль, яшчэ, не раз прыйдзецца задаць такое пытанне.

Вось яшчэ адзін слуцкі пісьменнік XVIII ст., якога ўпамінае Адам Мальдзіс: «Княжэвіч Гжэгож, паэт, перакладчык, гісторык, эканаміст, матэматык. Нарадзіўся ў 1737 г. у Беларусі. Выкладчык паэтыкі, рыторыкі і гісторыі ў Слуцку. Напісаў падручнік па матэматыцы і, бадай, першую на Славяншчыне кнігу аб грамаадводах»[2]. У спісах выкладчыкаў Княжэвіч Рыгор (Гжэгож) не значыцца. Відаць, ён працаваў у Слуцку не ў гімназіі, а ў езуіцкім калегіуме.

У пазнанскай бібліятэцы Рачынскіх Адам Мальдзіс адшукаў брашуру на 8 старонках, якая невядома калі і дзе выдавалася. Гэты твор на польскай мове мае доўгую назву: «Канфедэрацыя рыцарства і грамадзян В. кн. Літ. як рэлігіі старарускай, так і абедзвюх евангеліцкіх рэлігій, пачатая ў Слуцку года 1767 дня 20 месяца сакавіка, і маніфест, што папярэднічаў гэтай канфедэра-

---

[1] Мальдзіс А. І. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974. С. 82.

[2] Тамсама. С. 134.

цыі». «Канфедэрацыя» цікавая тым, — піша Мальдзіс, — што ў ёй прыведзены шматлікія факты здзекаў над праваслаўнымі з боку польскіх магнатаў і каталіцкага духавенства. Канфедэраты абураліся: «Цэлыя парафіі, цэрквы і святыні нашы, школы, друкарні, шпіталі на працягу стольких год абіраюцца і разбіраюцца. Пад тэкстам... паўтары старонкі подпісаў» [1].

«Канфедэрацыя», дадамо да слоў А. І. Мальдзіса, цікавая і тым, што яна сведчыць аб еднасці слуцкіх праваслаўных і пратэстантаў у барацьбе з каталіцызмам.

Відавочна, што ў брашуры адлюстраваны погляды членаў так званай Слуцкай канфедэрацыі — саюза кальвінісцкай, лютэранскай і праваслаўнай шляхты Вялікага княства Літоўскага, якая дамагалася ўраўнавання ў правах з каталікамі.

Чым была выклікана Слуцкая канфедэрацыя і як яна ўтварылася?

Калі пазней царскую Расію называлі турмой народаў, то Рэч Паспалітая ў другой палавіне XVIII ст. была таксама турмой для беларусаў і ўкраінцаў. Вось, напрыклад, якія інструкцыі ўтрымлівала «Настаўленне езуіта», дзе даволі шчыра пададзена ідэалогія польскіх улад: «Шляхта рускага веравызнання (як быццам, веравызнанне можа быць толькі па нацыянальнасці, а не па рэлігіі. — *заўвага Ф. Ф. Серна-Салаўевіча)* — не толькі схізматыкі (г. зн. якія засталіся ў праваслаўі. — *С. С.)*, але і уніяты, не павінны дапускацца да публічных пасад, — асабліва да тых, на якіх яны маглі б сабраць багацце, знайсці сяброў і набыць сілу і павагу, што паслужыла б умацаванню іх адзінаверцаў. Кожны паляк павінен старацца паказаць знявагу да рускіх (г. зн. беларусаў і ўкраінцаў. — *Р. Р.*), пазбягаць іх грамады, не заводзіць знаёмства з іх суседзямі, апрача

---

[1] Мальдзіс А. І. Таямніцы старажытных сховішчаў. С. 134.

выпадкаў, якія даюць нам карысць. У гутарках пры іх (праваслаўных, уніятах. — *Р. Р.*) неабходна гаварыць аб хлуслівасці паняццяў іх аб веры і да т. п. Завяраю, што пры такім пастаянным прыніжэнні яны не толькі згодзяцца перамяніць сваю веру, але стануць нават сарамецца імені рускага (чытай таксама: беларускага і ўкраінскага. — *Р. Р.*) і ніколі не будуць прызнаваць, што імі некалі былі. Шаноўныя паны не павінны прымаць рускіх (беларусаў, украінцаў. — *Р. Р.*) на службу, асабліва на такія пасады, на якіх яны маглі б набыць некаторую адукацыю, выключаючы толькі тых, якія падаюць надзею, што пераменяць сваю рэлігію. Застаючыся без працы, яны да крайняй беднасці і невуцтва дойдуць, будуць усімі зневажацца, так што, каб палепшыць сваё становішча, ім не заставалася другіх сродкаў, апрача перамены сваёй веры (рэлігіі)»[1].

Кацярына II і яе адданы саюзнік прускі кароль Фрыдрых II прапанавалі каралю Рэчы Паспалітай Станіславу Панятоўскаму праект пастановы, якой уводзіліся роўныя правы некаталіцкай шляхты з каталіцкай. Кацярына II падтрымала гэты праект сілаю: яна ўвяла сваё войска на тэрыторыю Рэчы Паспалітай. Тут пры дапамозе царскага пасла ў Варшаве былі створаны дзве шляхецкія канфедэрацыі (саюзы).

У Слуцку тады сабралася 266 канфедэратаў. Іх узначальвалі епіскап з Магілёва Георгій Каніскі і кіраўнік кальвіністаў у Беларусі і Літве генерал-лейтэнант Тамаш (Фама) Грабоўскі. Прыехаў і кур'ер Кацярыны II. У Спаскай царкве пад аховай рускіх салдат сход працягваўся тры дні. Канфедэраты выпрацавалі дакумент, у якім патрабавалі роўнасці для праваслаўнай і пратэстанцкай шляхты з каталіцкай. Апрача таго, выбралі савет з 33 чалавек, які ўзначалілі Г. Каніскі і Т. Гра-

[1] Цыт. па: Серно-Соловьевич Ф. Ф. Древне-русский город Слуцк и его святыни. С. 17.

боўскі, і звярнуліся з просьбай аб дапамозе да Кацярыны II і каралёў Швецыі, Англіі, Даніі і Прусіі. Акт падпісалі 248 чалавек. «Слуцкая канфедэрацыя, — адзначае А. П. Грыцкевіч, — была адразу ж прынята пад «найвысочайшую протекцию» Кацярыны II» [1].

Пад націскам канфедэратаў, за спіною якіх стаялі Кацярына II і Фрыдрых II, сейм Рэчы Паспалітай прыняў пастанову аб роўнасці правоў праваслаўных і пратэстантаў з каталікамі. У ёй нічога не гаварылася наконт правоў простага народа. А становішча яго ў апошнія гады існавання Рэчы Паспалітай было жахлівым.

У 1783 г. архімандрытам слуцкага Траўчанскага манастыра стаў былы ігумен пры рускім пасольстве ў Варшаве Віктар Садкоўскі. У 1785 г. Кацярына II зацвердзіла яго кіраўніком праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай і епіскапам Пераяслаўскім і Барыспальскім. Такім чынам, Слуцк зрабіўся праваслаўнай сталіцай не толькі Беларусі, але і праваслаўнай часткі Правабярэжнай Украіны, Літвы і Польшчы. Кіраўніку праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай не вельмі давалі разгарнуцца каталіцкія верхаводы. У 1789 г. яго арыштавалі і пасадзілі спачатку ў нясвіжскую замкавую турму, а потым адправілі ў Варшаву. У астрозе ён правёў больш за тры гады.

У лістападзе 1791 г. Слуцкае княства было ліквідавана. Слуцк стаў цэнтрам Случарэцкага павета. Сам жа горад працягваў заставацца ўласнасцю князя Радзівіла. 31 мая 1792 г. сюды ўступілі рускія войскі, а ў 1793 г. паводле другога падзелу Рэчы Паспалітай Слуцк і Случчына разам з некаторымі іншымі рэгіёнамі Беларусі былі афіцыйна далучаны да Расіі.

Закончылася XVIII ст., а разам з ім і старажытны перыяд у развіцці літаратуры і мастацтва Случчыны і ўсёй Беларусі.

---

[1] Грицкевич А. П. Древний город на Случи. С. 28.

## *СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ*

Антология педагогической мысли Белорусской ССР. М., 1986.
Антологія українськоі поезіі. В. 2. т. Т. I, Київ, 1984.
Гісторыя беларускага тэатра. У 3 т. Т. 1, Мн., 1983.
Глебов И. Историческая записка о Слуцкой гимназии 1617—1630—1901 года. Вильно, 1903.
Грицкевич А. П. Древний город на Случи. Мн., 1985.
Грицкевич А. П. Слуцк. Мн., 1970.
Ерчич Властимир. Мануил (Михаил) Козачинский и ньегова траедокомедия. Нови Сад—Београд, 1980.
Мальдзіс А. І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980.
Мальдзіс А. І. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974.
Полное собрание русских летописей. Т. 35. М., 1980.
Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. Мн., 1983.
Порецкий Я. И. Соломон Рысинский. Мн., 1983.
Русская силлабическая поэзия XVII—XVIII вв. Л., 1970.
Серно-Соловьевич Ф. Ф. Древне-русский город Слуцк и его святыни. Вильно, 1896.
Улащик Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. М., 1985.
Хроника Быховца. М., 1966.
Шляпников И. А. Св. Дмитрий Ростовский и его время (1651—1709). СПб., 1891.
Энцыклапедыя Літаратуры і Мастацтва Беларусі. У 5 т. Мн., 1984—1987.

## ЗМЕСТ

З глыбінь стагоддзяў 3
Літаратура і культура Случчыны XII—XV стст. 8
Слуцкія летапісы XVI ст. 19
У часы Рэфармацыі 26
Ад Алелькавічаў да Радзівілаў 30
Саламон Рысінскі 31
Педагогі і іх выхаванцы 36
Слуцкі «дыярыуш» 40
Прадаўжаючы справу Скарыны 43
Дзімітрый Растоўскі 43
Мемуары Яна Цадроўскага 47
Ян Андрэй Белабоцкі (Белаблоцкі) 51
Ілья Капіевіч 53
Напярэдадні Асветніцтва 54
Эмануіл (Міхаіл) Казачынскі ў Слуцку 58
Пад апекай Мельпамены і Тэрпсіхоры 63
На закаце Рэчы Паспалітай 65
Спіс выкарыстанай літаратуры 70

Научно-популярное издание

**Родченко** Григорий Викторович

**СЛУЦКАЯ СТАРИНА**

*(Факты и размышления)*

Минск, издательство «Полымя», 1991

На белорусском языке

Навукова-папулярнае выданне

**Родчанка** Рыгор Віктаравіч

**СЛУЦКАЯ СТАРАСВЕТЧЫНА**

*(Факты і разважанні)*

Загадчыца рэдакцыі Л. І. КРУГЛОВА
Рэдактар А. І. САЛАМЕВІЧ
Мастацкі рэдактар І. А. ДЗЯМКОЎСКІ
Тэхнічныя рэдактары В. У. КУЗЬМІНА, С. І. СТАРАВЕРАВА
Карэктар Л. І. ЖЫЛІНСКАЯ

ІБ № 1009

Здадзена ў набор 12.10.90. Падпісана да друку 25.11.91. Фармат 70×108[1]/32. Папера друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Ум. друк. арк. 3,15. Ум. фарб. адб. 3,33. Ул.-выд. арк 3,08. Тыраж 1 200 экз. Выд. № 6645. Зак. 15. Цана 2 р. 20 к.

Выдавецтва «Полымя» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. 220600, Мінск, пр. Машэрава, 11.

Друкарня «Победа» 222310, Маладзечна, В. Таўлая, 11.

2 р. 20 к.

